ЗАЛЕЖНАСЦЬ, ЯКОЙ НАМ НЕ ХАПАЛА?

7

ЁН ПАДЗЯЛІЎ БЕЛАРУСЬ НА РАЁНЫ...

11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

4 ЧЭРВЕНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 102 (28969)

ЛІЧБА ДНЯ

1289

нацыянальных паркаў, запаведнікаў, заказнікаў і помнікаў прыроды, якія адносяцца да асабліва ахоўных прыродных тэрыторый, зарэгістравана сёння ў нашай краіне. Агульная плошча гэтых ахоўных тэрыторый складае каля 1861,5 тысячы га — 8,9 % ад плошчы краіны. Іх мэта — зберагчы ўнікальныя прыродныя ўтварэнні, падтрымаць біялагічную і ландшафтную разнастайнасць, захаваць генафонд дзікіх раслін і жывёл. Усяго ў Беларусі налічваецца больш за 20 тысяч рэк, з іх 8 — працягласцю больш за 500 км і 11 — працягласцю ад 250 да 500 км. У нас размешчана каля 10,8 тысячы азёр. Тым часам у краіне назіраецца станоўчая тэндэнцыя зніжэння аб'ёмаў здабычы вады з прыродных крыніц, што скарачае нагрузку на водныя рэсурсы, праводзіцца работа па скарачэнні аб'ёмаў выкідаў і скідаў забруджвальных рэчываў у прыроднае асяроддзе.

МЁРСКІ КАЎБОЙ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Славамір БЫДЗАН шосты год працуе жывёлаводам у ААТ «Чарэсы» Мёрскага раёна. З самага пачатку яму даверылі варанога каня па мянушцы Вугалёк. Калі статак першацёлак выходзіць на летнія кругласутачныя выпасы, Славамір не расстаецца са сваім сябрам. Пад наглядам жывёлавода — амаль трыста галоў будучага дойнага статка гаспадаркі, а з Вугальком паспяваць за рагулямі вельмі зручна!

КАРАТКА

• Гомель прызнаны найлепшым абласным цэнтрам па санітарным стане і добраўпарадкаванні.

• Сістэмы і абсталяванне першага энергаблока БелАЭС пачалі рыхтаваць да гідраўлічных выпрабаванняў.

• У пунктах пропуску Гродзенскай мытні для балельшчыкаў II Еўрапейскіх гульняў выдзелілі асобныя калідоры.

• Нацыянальны аэрапорт Мінск прызнаны найлепшым сярод краін СНД за 2018 год.

• Сляды бурага мядзведзя заўважылі ў Белавежскай пушчы каля ракі Левая Лясная і на найбліжэйшай дарозе.

Шлях да святыні

ШЧЫРАЯ ВЕРА ДАПАМАГЛА

У Гомелі распачата будаўніцтва храма ў гонар святіцеля Іаана Шанхайскага і Сан-Францыскага, і свяшчэннапакутніка Іаана, епіскапа Рыльскага. Камень і памятную капсулу ў яго падмурак заклаў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Дарэчы, дзеянне носіць глыбокі сакральны сэнс: у праваслаўнай традыцыі закладны камень сімвалізуе самога Ісуса Хрыста.

СТАР. 5

Сітуацыя

ДУБРАВЕНКА ЗАХВАРЭЛА?

Гэта адна з малых рэк Магілёва, якая з'яўляецца яго ўпрыгажэннем і месцам адпачынку шматлікіх гараджан. Яе маляўнічы кавалачак у самым цэнтры горада каля гасцініцы «Магілёў» вельмі вабіць гасцей і турыстаў. Тут можна выпіць кубачак кавы ў летняй кавярні, пакарміць дзікіх качак, падыхаць свежай прахалодай у спякотны летні дзень. Але магілёўскія эколагі ад грамадскасці звяртаюць увагу, што не ўсё так добра, як здаецца на першы погляд. Рэчка цяжка хварэе, і калі не заняцца яе аздараўленнем сёння, заўтра можа быць позна.

Актывісты заклікаюць магіляўчан не быць абыякавымі да прыроды.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – НЕ ПАШКАДУЕЦЕ!

САДЫ ДРУЖБЫ

Эмамалі Рахмон летам наведае Беларусь

Пра гэта стала вядома падчас сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Таджыкістана ў Беларусі Махмадшарыфам Махмудам Хакдодам.

«У найбліжэйшы час — мы пра гэта яшчэ раз дамовіліся — прыедзе ў Беларусь ваш прэзідэнт, наш паважаны чалавек, яго ведаюць, любяць у Беларусі. І ведае не толькі, як у нас прынята цяпер казаць, эліта — тыя, якія займаюцца палітыкай. Эмамалі Шарыпавіча добра ведае беларускі народ, мы чакаем яго прыезду. Таму наша сустрэча з вамі важная яшчэ і з гэтай нагоды», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт нагадаў, што бакі дамовіліся вылучыць дні візіту напярэдадні закрыцця II Еўрапейскіх гульняў. «Абмяркуем усе пытанні, паглядзім, як выконваюцца нашы дамоўленасці. Ён пабудзе ў Беларусі, я яго прасіў пра гэта. Няхай пазнаёміцца бліжэй з нашай прыродай, з нашай краінай», — сказаў Аляксандр Лукашэнка і дадаў, што Эмамалі Рахмона трэба сустрэць годна.

Таксама беларускі лідар расказаў аб сумесным праекце Беларусі і Таджыкістана, які ён назваў сімвалам нашай дружбы, — гэта сады. «Мы паспрабуем вырошчваць тое, што вы ў сябе вырошчваеце. Гародніна, пладовыя культуры ўжо завезены сюды, і на поўдні нашай краіны мы спрабуем некаторыя варыянты. Калі пойдзе гэта — вы будзеце піянерам у Беларусі па перамяшчэнні садоў крайняга поўдня некалі вялікай краіны Савецкага Саюза сюды, у паўночную Беларусь», — з усмешкай адзначыў Прэзідэнт і дадаў, што праект павінен атрымацца.

На сустрэчы закранулі тэму «дарожнай карты». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што яе трэба строга рэалізоўваць, бо гэта выгадна дзвюм краінам.

Якія ж поспехі ў канкрэтных кірунках супрацоўніцтва? Па словах кіраўніка дзяржавы, раней Эмамалі Рахмон паведаміў яму аб выпуску 500 трактароў сёлета на сумесным прадпрыемстве ў горадзе Гісар, вялікі попыт ёсць і ў суседніх дзяржавах. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларускі бок гатовы і далей развіваць вытворчасць.

«Насцярожвае тое, што ў нас адбылося пэўнае падзенне тавараабароту. Над гэтым трэба нашым МЗС-ам і ўрадам папрацаваць, каб ураўнаваць тавараабарот паміж дзвюма краінамі. І больш актыўна выходзіць на рынкі трэціх краін з нашай сумеснай з вамі прадукцыяй», — дадаў ён.

У адказ пасол Таджыкістана ў Беларусі адзначыў, што ў яго краіне са шчырасцю і любоўю ставяцца да дружалюбнага беларускага народа, вельмі шануюць адносіны паміж краінамі. Паводле яго слоў, у Таджыкістане высока ацэньваюць выстаўкі нашай краіны, правядзенне бізнес-форуму Беларусь — Таджыкістан — Афганістан, а таксама вялікі праект — сумеснае прадпрыемства па зборы сельгастэхнікі.

Негатыву ў адносінах няма

Па выніках сустрэчы з Прэзідэнтам Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Таджыкістана ў Беларусі Махмадшарыф Махмуд Хакдод пагутарыў з журналістамі.

Паводле слоў пасла, у яго адбылася вельмі грунтоўная размова з беларускім лідарам. Гаварылі пра стан і перспектывы развіцця двухбаковых адносін.

Махмадшарыф Махмуд Хакдод таксама паведаміў, што ў красавіку ў Мінску адбылося пасяджэнне Міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, дзе быў выпрацаваны план мерапрыемстваў па рэалізацыі пастаўленых задач, асабліва па тэме стварэння новых сумесных вытворчасцяў, у першую чаргу — малака. У цэлым дасягнутыя паміж краінамі дамоўленасці рэалізуюцца паспяхова, дадаў ён.

Пасол згадаў і сады дружбы ў Беларусі. Так, мноства сартоў розных раслін з Таджыкістана ўжо пасаджаны ў беларускую зямлю, яны прыжыліся ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях. Ёсць планы па стварэнні саду грэцкага арэха ў Магілёўскай вобласці.

Адносіны паміж Таджыкістанам і Беларуссю пасол назваў вельмі добрымі, брацкімі і сяброўскімі. Гэтаму спрыяе як гістарычны кантэкст, так і рэгулярныя сустрэчы, візіты, у тым ліку на самым высокім узроўні. На думку пасла, негатыўных момантаў у нашых адносінах няма.

«Тавараабарот у пачатку года трошкі ўпаў — гэта не негатыў. Пачатак года, самі разумееце, дагаворы ёсць, а пастаўкі яшчэ не адбыліся. Да канца года ёсць час, выправім гэта становішча», — сказаў ён.

Тавараабарот Беларусі і Таджыкістана ў 2018 годзе склаў 37,4 мільёна долараў, скараціўшыся амаль на 13 працэнтаў. Пры гэтым беларускі экспарт дасягнуў 33,4 мільёна долараў, імпарт — 4 мільёны. З пачатку гэтага года ўзаемны гандаль паміж краінамі таксама дэманструе не лепшыя паказчыкі. У студзені—сакавіку тавараабарот знізіўся да 8,1 мільёна долараў, склаўшы 70,3 працэнта ад аналагічнага перыяду мінулага года.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

CNN: канцылярыя Мэй спрабуе перашкодзіць сустрэчы Трампа з прыхільнікамі Brexit

Канцылярыя брытанскага прэм'ер-міністра Тэрэзы Мэй робіць усё магчымае для адмены сустрэчы прэзідэнта ЗША Дональда Трампа з радыкальнымі прыхільнікамі Brexit. Пра гэта ў панядзелак паведаміў тэлеканал CNN са спасылкай на крыніцу, блізкую да лідара Партыі Brexit Найджэла Фаража.

Паводле яго даных, Трамп у аўторак можа правесці сустрэчу з самім Фаражам, бізнесменам Аронам Бэнксам, які падазраваўся ў сувязях з Расіяй з мэтай атрымання фінансавання для еўраскептыкаў у перыяд правядзення рэферэндуму па Brexit у 2016 годзе. «Так, сапраўды, на Даўнінг-стрыт, 10 спрабуюць спыніць Найджэла і нас», — адзначыла крыніца.

Зяленскі прызначыў Кучму прадстаўніком Украіны ў ТКГ

Леанід Кучма будзе прадстаўляць Украіну ў трохбаковай кантактнай групе (ТКГ) па сітуацыі на ўсходзе Украіны. Пра гэта заявіў прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі падчас брыфінгу ў Кіеве. «У нас ёсць агульная пазіцыя — гэта аднаўленне перагавораў з нагоды Данбаса ў «нармандскім фармаце», разблакіроўка мінскага працэсу», — адзначыў Уладзімір Зяленскі. Ён таксама паведаміў, што наступнае пасяджэнне ТКГ адбудзецца 5 чэрвеня ў Мінску.

Новы набор атрада расійскіх касманаўтаў будзе арыентаваны на месяцовыя праграмы

Нядаўна адкрыты набор у атрад касманаўтаў будзе рыхтавацца для палётаў на Месяц, паведаміў учора на прэс-канферэнцыі ў Маскве дырэктар Інстытута медыка-біялагічных праблем РАН Алег Арлоў.

«Патрабаванні з пункту гледжання медыцыны высокія. Кандыдат павінен быць фізічна здаровым чалавекам, псіхічна, псіхалагічна. Ёсць некаторыя асаблівасці: у рамках тых допускаў мы будзем звяртаць увагу на асаблівасці кандыдата з пункту гледжання гіпатэтычнай магчымасці палётаў на перспектыўнай тэхніцы, удзелу ў месяцовых місіях», — сказаў ён.

Арлоў адзначыў, што ўдзел прафесійных медыкаў і біёлагаў у новым адборы ў атрад касманаўтаў абумоўлены неабходнасцю такіх спецыяльнасцяў у месяцовых экіпажах.

«Калі мы гаворым пра перспектыўную месяцовую праграму, у нас павінны быць спецыялісты, гатовыя ў гэтай праграме працаваць. Гэта павінны быць не толькі прафесійныя камандзіры, бортінжынер. Гэта павінны быць спецыялісты-вучоныя, і, прынамсі ў першых месяцовых праграмах, абавязковы ўдзел медыкаў», — сказаў ён.

Лідар Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі абвясціла аб адстаўцы

Кіраўнік Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі Андрэа Налес паведаміла аб адстаўцы. Яна сказала, што пакіне таксама пасаду кіраўніка фракцыі СДПГ у германскім парламенце, паведамляе Bild. Налес дадала, што афіцыйна падасць заяву аб адстаўцы 3 чэрвеня на пасяджэнні сваёй фракцыі. Яна патлумачыла, што яе рашэнне сысці са сваіх пасад дапаможа правільна прызначыць пераемнікаў. Палітык прызналася, што падставай для такога кроку стаў недахоп падтрымкі.

Кіраўніцтва нямецкага Хрысціянска-дэмакратычнага саюза (ХДС) паведаміла, што працягне працаваць у бундэстагу з кааліцыяй, у якую ўваходзяць ХДС, Хрысціянска-сацыяльны саюз (ХСС) і СДПГ. Андрэа Налес прыняла рашэнне аб адстаўцы пасля правалу сваёй партыі на прайшоўшых нядаўна выбарах у Еўрапарламент, дзе СДПГ заняла трэцяе месца, страціўшы 12 % у параўнанні з 2014 годам.

Парламенцкі дзённік

У АСНОВЕ КУРСУ — МІР І СТАБІЛЬНАСЦЬ

Парламенты Беларусі і Славакіі будуць пашыраць узаемадзеянне

Шчырасць намеру развіваць узаемавыгаднае і доўгатэрміновае супрацоўніцтва са Славакіяй і Еўрапейскім саюзам падкрэсліў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА на сустрэчы з парламенцкай дэлегацыяй Славацкай Рэспублікі.

«Галоўнае, каб узаемадзеянне было дынамічнае і эфектыўнае — думаю, сёння менавіта гэтага нам не стае», — адзначыў кіраўнік ніжняй палаты парламента. Уладзімір Андрэйчанка паведаміў, што рэспубліка праводзіць шматвектарны знешнепалітычны курс. Так, знешнегандлёвы абарот амаль напалову складаецца з гандлю краінамі ЕС, а 65 % беларускай прадукцыі прадаецца за межамі дзяржавы. Леташні тавараабарот са Славакіяй узрос да 218 мільёнаў долараў.

«У аснове знешнепалітычнага курсу — незалежнасць, мір, стабільнасць у рэгіёне і, вядома, дабрабыт нашага насельніцтва. Еўрапейскі саюз — моцнае інтэграцыйнае аб'яднанне, а Славакія — адна з блізкіх нам краін, якой мы ўдзячныя за падтрымку», — падкрэсліў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Ён лічыць, што Беларусі трэба працягваць супрацоўніцтва на міжнародных парламенцкіх пляцоўках і пашыраць узаемадзеянне ў рамках Вішаградскай групы (сёлета ў ёй старшынствуе Славакія). Акрамя таго, па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, неабходна больш актыўна карыстацца парламенцкім вымярэннем для развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, узаемадзеяння ў галінах культуры, спорту, адукацыі.

На думку старшыні Палаты прадстаўнікоў, у перспектыве ёсць магчымасць стварэння дарожнай карты супрацоўніцтва і падпісання пагаднення або мемарандума аб супрацоўніцтве паміж парламентамі. Адзначыў Уладзімір Андрэйчанка і ролю паслоў і кіраўнікоў груп сяброўства ў парламентах абедзвюх краін.

Старшыня Нацыянальнага савета Славацкай Рэспублікі Андрэй ДАНКА згадзіўся, што ў любой галіне знойдзецца шмат белых плям, над якімі можна працаваць: «Асабліва важна, што нашы народы блізкія па гісторыі, ментальнасці. На гэтых агульных кропках мы можам будаваць нашы адносіны. Думаю, пачынаць трэба як мага хутчэй».

Старшыня Нацыянальнага савета Славакіі адзначыў, што Беларусь вядомая патэнцыялам у сферах аховы здароўя і адукацыі, а спецыялістаў у гэтай галіне з задавальненнем віталі б і ў цэнтральнаеўрапейскай дзяржаве. Андрэй Данка прапанаваў у жніўні правесці двухбаковыя сустрэчы асобных камісій абодвух парламентаў і паабяцаў паскорыць працэс узаемнага прызнання дыпломаў аб вышэйшай адукацыі.

Варвара МАРОЗАВА.

На кубінскім напрамку

У Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь прайшла рабочая сустрэча кіраўніка ведамства Аляксандра Карлюкевіча з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Куба ў Рэспубліцы Беларусь Хуанам Вальдэсам Фігероа.

Пасол паведаміў аб развіцці беларуска-кубінскіх адносін у розных галінах жыцця. Размова ішла ў тым ліку пра ролю масмедыя ў пашырэнні турыстычнага складніка ў адносінах паміж краінамі. Была дасягнута дамоўленасць аб арганізацыі прэс-тура беларускіх журналістаў у Рэспубліку Куба. У найбліжэйшы час кубінскі бок паспрыяе выпуску асобнага нумара часопіса «Беларусь», прысвечанага Востраву Свабоды. Кубінскі амбасадар паабяцаў, што літаратары, кнігавыдаўцы, пісьменнікі яго краіны возьмуць удзел у Дні беларускага пісьменства ў верасні 2019 года, у Міжнародным сімпозіуме «Пісьменнік і час», які пройдзе ў Мінску ў лютым 2020 года.

На ліпень запланаваны круглы стол па кубінска-беларускіх літаратурных сувязях у XX стагоддзі, які пройдзе ў рэдакцыі аднаго з беларускіх літаратурна-мастацкіх перыядычных выданняў. Вядома ж, размова на ім пойдзе пра пісьменнікаў, дзеячаў культуры з Беларусі, якія наведвалі Кубу, пісалі пра яе, — народных паэтаў Беларусі Максіма Танка, Рыгора Барадуліна, празаіка Алеся Жука, перакладчыка Карласа Шэрмана, народных артыстаў СССР Уладзіміра Мулявіна, Ігара Лучанка. Спадар Хуан Вальдэс Фігероа ўнёс шэраг прапаноў па супрацоўніцтве ў галіне электронных масмедыя, па распаўсюджванні ведаў пра Беларусь у найбольш папулярных сацыяльных сетках, інтэрнэт-рэсурсах на Кубе.

Сяргей ШЫЧКО.

Калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь выказвае шчырыя спачуванні намесніку начальніка галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Свідзінскаму Мікалаю Іванавічу ў сувязі са смерцю МАЦІ.

Класныя навіны

У ГЛЫБІНКУ БЕЗ ПРЫМУСУ

БПС-Ашчадбанк і Міністэрства адукацыі запрашаюць маладых ініцыятыўных педагогаў стаць удзельнікамі сумеснай адукацыйнай праграмы «Настаўнік для Беларусі».

Яе мэта — прыцягнуць у школы ў невялікіх гарадах і населеных пунктах крэатыўных і неабыякавых настаўнікаў, якія хочуць і могуць прыўнесці ў прафесію педагога новыя цікавыя ідэі, умеюць спраўляцца з цяжкасцямі, захоўваючы аптымізм, імкнуцца да самаразвіцця, гатовыя да змен (у тым ліку і да пераезду на новае месца) і вераць у свае сілы.

Якіх-небудзь жорсткіх абмежаванняў для ўдзелу ў праекце не ўстаноўлена: гэта могуць быць як сёлетнія выпускнікі педфакультэтаў, так і вопытныя настаўнікі ці нават сям'я педагогаў. Ключавой з'яўляецца наяўнасць профільнай педагагічнай адукацыі або кваліфікацыі педагога.

Сёлета выберуць першых 12 настаўнікаў, якія на два гады адправяцца працаваць у шэсць школ у глыбінцы, — прычым па двое, бо разам з аднадумцам будзе прасцей асвойвацца на новым месцы.

Для ўдзелу ў праграме трэба запоўніць анкету на сайце teach4.by. Затым кандыдатаў чакае скайп-інтэрв'ю, а на апошнім этапе — субяседаванне ў Мінску. Ключавымі крытэрыямі для адбору стануць прафесійны ўзровень, камунікатыўныя навыкі і свядомая матывацыя.

Усе ўдзельнікі пройдуць месячны летні інтэнсіў, дзе асвояць сучасныя падыходы да педагогікі і выкладання, разаўюць свае асабістыя і лідарскія якасці, атрымаюць веды ў галіне праектнага менеджменту.

Кожны атрымае ад БПС-Ашчадбанка дадатковую матэрыяльную падтрымку: акрамя зарплаты, настаўнікам будзе два гады налічвацца стыпендыя ў памеры 250 рублёў. Іх таксама забяспечаць ноўтбукамі і кампенсуюць выдаткі на жыллё пры неабходнасці пераезду.

За кожным з удзельнікаў праекта замацуюць куратара — вопытнага выкладчыка, да якога заўсёды можна будзе звярнуцца па дапамогу. Арганізатары плануюць, што кожную чвэрць навучальнага года ўсе ўдзельнікі будуць збірацца і падводзіць разам вынікі работ у школах, абмяркоўваць праблемы, якія акрэсліліся, атрымліваць новыя веды і метадалагічную падтрымку.

«Запускаючы праграму «Настаўнік для Беларусі», мы думалі пра тое, каб зрабіць якасную адукацыю даступнай для кожнага дзіцяці ў любой школе. Праграма накіравана на рашэнне доўгатэрміновых задач, — падкрэслівае **намеснік старшыні праўлення БПС-Ашчадбанка Лілія АСТАПОВІЧ.** — Наш унёсак у праграму сёлета складае 240 тысяч рублёў. У будучыні да нас змогуць далучыцца любыя кампаніі-донары, якія пажадаюць зрабіць унёсак у развіццё якаснай адукацыі ў рэгіёнах».

Надзея НІКАЛАЕВА.

Супрацоўніцтва

IT, робататэхніка, медыцына

Беларускія і кітайскія студэнты, а таксама маладыя вучоныя прэзентавалі свае распрацоўкі на маладзёжным конкурсе «ЭкаТэхнаКрос — адзін пояс, адзін шлях».

Фота bntu.by

Як расказаў **начальнік Беларускага цэнтра па навукова-тэхнічным супрацоўніцтве з КНР дзяржпрадпрыемства «Навукова-тэхналагічны парк БНТУ «Палітэхнік» Аляксей АЛДОШЫН,** было прадстаўлена 16 праектаў у галінах машынабудавання, металургіі, IT, медыцыны, адукацыі. Пераможцамі конкурсу сталі выпускнік машынабудаўнічага факультэта БНТУ Максім Масальскі з праектам па робататэхніцы і аспірант машынабудаўнічага факультэта БНТУ Дай Вэньцы, які прадставіў праект хвалявода для лячэння захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы.

Удзельнікі конкурсу наведалі пляцоўкі альтэрнатыўных крыніц энергіі ў Рэсурсным цэнтры «ЭкаТэхнаПарк — Волма». У цэнтры яны ўзялі ўдзел у інтэлектуальных гульнях «ЭкаЖыццё», «Бізнес-Бой», квэст-руме «Лаві магчымасці на старце!», спартыўных мерапрыемствах. У камандных спаборніцтвах узялі верх факультэт горнай справы і інжынернай экалогіі БНТУ і каманда аспірантаў і магістрантаў з КНР.

На базе цэнтра была адкрыта беларуска-кітайская інавацыйная лабараторыя маладых вучоных па інжынерыі паверхні пры падтрымцы Пасольства КНР у Беларусі.

— Дзякуючы лабараторыі студэнты яшчэ на пачатку навучання ва ўніверсітэце змогуць прыходзіць са сваімі ідэямі і ператвараць іх у жыццё з дапамогай прафесараў і вучоных, — адзначыў Аляксей Алдошын. — Увасобленыя ў метале распрацоўкі будуць укаранёныя ў шэрагу галін, у тым ліку ў сельскай гаспадарцы, машынабудаванні, харчовай прамысловасці, медыцыне.

Вераніка КОЛАСАВА.

Надвор'е

ДА НАС ІДЗЕ СПЯКОТА

Ужо ў пятніцу ўначы будзе плюс 20, а ўдзень — да 31 цяпла

І сапраўды, з першых дзён лета на нашай тэрыторыі ўсталявалася анамальна гарачае (для пачатку чэрвеня) надвор'е з тэмпературным фонам, які на 6—8 градусаў вышэй за кліматычную норму, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Чакаецца, што ў першай палове тыдня на фоне павышанага атмасфернага ціску будзе пераважна без ападкаў, а ў далейшым месцамі не абыдзецца без кароткачасовых навальнічных дажджоў. У аўторак будзе пераважна без ападкаў, удзень у сераду месцамі па паўднёва-заходняй палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Прагназуецца, што ўначы паветра прагрэецца да 11—18 цяпла, а ўдзень будзе да 23—29 градусаў вышэй за нуль.

У чацвер у асобных раёнах краіны чакаюцца кароткачасовыя навальнічныя дажджы. У гэтыя дні не пасвяжэе нават уначы, калі тэмпература паветра ў цёмны час сутак не будзе апускацца ніжэй плюс 13 — 19 градусаў, а ўдзень — 24—29 цяпла. У пятніцу месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. У апошні рабочы дзень гэтага тыдня ўначы будзе яшчэ цяплей: ад плюс 14 градусаў да плюс 20 градусаў, у дзённыя гадзіны паветра прагрэецца да рэкордных плюс 24—31 градуса. Пара ў адпачынак, хоць... не факт. У ліпені будзе яшчэ цяплей.

Сяргей КУРКАЧ.

Ведай нашых!

Беларус стаў прызёрам «Дзіцячай Новай хвалі»

12-гадовы мінчанін Яраслаў Саколікаў увайшоў у лік пераможцаў міжнароднага конкурсу «Дзіцячая Новая хваля», які па традыцыі прайшоў у «Артэку». Сёлета ў фінале гэтага творчага спаборніцтва ўдзельнічалі юныя артысты з дзевяці краін: Абхазіі, Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Вялікабрытаніі, Літвы, Мальты, Расіі і Узбекістана.

Фота: newwavejunior.eu.

Па выніках двух дзён выступленняў і работы журы на чале з народным артыстам Расіі кампазітарам Ігарам Крутым беларускі канкурсант заняў другое месца. Узнагародай для яго стане песня, створаная спецыяльна для Яраслава прафесійнымі аўтарамі, і яе запіс у студыі. «Гэта нерэальнае адчуванне! Я такі рады і ўдзячны маёй сям'і, педагогам, Акадэміі Ігара Крутога, Артэку, усім, хто падтрымліваў, — падзяліўся юны спявак у сацсетках. — Верце ў мары, яны часам здзяйсняюцца!»

Першае месца і прызавы запіс кліпа падзялілі паміж сабой артысты з Расіі, трэцюю прыступку заняла прадстаўніца Узбекістана, якая стане госцяй «Дзіцячага Еўрабачання—2019».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Новы маршрут

АД ГРОДНА ДА ПОЛЬСКАЙ МЯЖЫ

На Аўгустоўскім канале ўрачыста адкрылі новы міжнародны веламаршрут

«Аўгуст Вела» праклаў шлях аматарам веласіпеднага турызму з Еўропы ў Беларусь. Маршрут, працягласць якога 50 кіламетраў, злучаецца з польскім Green Velo і сеткай еўрапейскіх маршрутаў Euro Velo. Урачыстае адкрыццё адбылося з удзелам кіраўніцтва Гродзенскага аблвыканкама і Падляскага ваяводства Польшчы. Прадстаўнікі ўлады першымі праехалі па беларускай частцы новага веласіпеднага маршрута.

Фота БелТА

Пачынаецца яна ад пункта пропуску «Лясная—Рудаўка» на канале і завяршаецца ў Гродне. «Аўгуст Вела» пракладзены па маляўнічых і гістарычных мясцінах рэгіёна. Ён праходзіць уздоўж канала праз усе шлюзы, пасля ідзе ў бок вёскі Радзівілкі, дзе можна ўбачыць старажытную сядзібу Гурскіх. На шляху маршрута — аграгарадок Сапоцкін з цікавым музеем пісанкі, у некалькіх кіламетрах — палац Валовічаў у Свяцку. У хуткім часе тут завершыцца рэканструкцыя пад культурна-забаўляльны комплекс. Пад Гродна веламаршрут цягнецца ўздоўж Нёмана і падыходзіць да турыстычнай базы «Прывал».

Як расказалі ва ўпраўленні спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама, увесь маршрут прамаркіраваны ў адпаведнасці з еўрапейскімі стандартамі, устаноўлена некалькі сотняў паказальнікаў і каля дзясятка картаў-схем. Для зручнасці турыстаў прадугледжаны месцы адпачынку з альтанкамі, паркоўкамі і санітарнымі зонамі.

Плануецца, што новы веламаршрут у найбліжэйшы час звяжа Аўгустоўскі канал і Белавежскую пушчу. «Белавежа Вела» пройдзе па дзвюх бязвізавых зонах Беларусі, па тэрыторыі Люблінскага ваяводства Польшчы і вернецца да Аўгустоўскага канала. Трансгранічны праект актуальны дзякуючы росту турыстычнага патоку ў бязвізавыя рэгіёны, а таксама запланаванаму аб'яднанню гродзенскай і брэсцкай бязвізавых зон.

Маршрут «Аўгуст Вела» створаны ў рамках трансгранічнага праекта па падтрымцы прадпрымальніцтва праз развіццё інфраструктуры Гродзенскай вобласці.

Дарэчы, новы турыстычны сезон на Аўгустоўскім канале пачаўся з 1 мая, калі на памежным шлюзе пачаў работу сезонны пункт пропуску. У раёне шлюза Дамброўка адкрыліся аб'екты харчавання і пункты пракату.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ДУБРАВЕНКА ЗАХВАРЭЛА?

Леанід Платоненка паказвае адкрытыя небяспечныя калодзежы ў Пячэрскім лесе.

У ЧЫМ ПРАБЛЕМА?

На лісце фармату А4 падрабязны дыягназ стану ракі. Магіляўчанін Леанід Платоненка звяртае ўвагу на тое, што ў выніку дзейнасці чалавека былі парушаны яе натуральны гідралагічны і гідрахімічны баланс.

Прысненскі ручай сілкуецца сцёкамі.

Няўзброеным вокам відаць, што нават у спякотныя дні бетонныя апоры ўздоўж ракі мокнуць і пакрываюцца зелянінай, звяртаюць увагу актывісты. Гэта прамое сведчанне таго, што падчас будаўніцтва былі заблакіраваныя натуральныя крыніцы, якія падсілкоўвалі рэчку. А вось колькасць неачышчаных прамысловых стокаў, адзначаюць яны, толькі павялічваецца. Не на карысць рацэ ідзе і суседства з шматпавярховікамі, будаўніцтва якіх у непасрэднай блізкасці ад зоны адпачынку апошнім часам вельмі актывізавалася. Выказваюцца асцярогі, што тыя інжынерныя сеткі, якія будаваліся раней, не вытрымаюць дадатковай нагрузкі, і аднойчы адбудзецца экалагічная катастрофа. Гэта толькі некаторыя з сігналаў, якія выказвае аўтар у сваім лісце.

У адказе на яго за подпісам **намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслана ПАРХАМОВІЧА** ідзе спасылка на шэраг гарадскіх службаў, якія ажыццяўляюць кантроль за гэтым аб'ектам. Напрыклад, Магілёўскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі дае справаздачу, што парушэнняў санітарных нормаў і правілаў пры эксплуатацыі ракі Дубравенкі не выяўлена, што водны аб'ект не выкарыстоўваецца для пітных і гаспадарча-бытавых патрэб і не належыць да зон рэкрэацыі, дзе купанне не прадугледжана. Магілёўскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ў Магілёве, у сваю чаргу, паведамляе, што скіды сцёкавых вод і дажджавых у Дубравенку ажыццяўляюць — «Гарводаканал» і «Дарожна-маставое прадпрыемства». Паведамляецца таксама, што прадпрыемствам устаноўлены нарматывы дапушчальных скідаў хімічных і іншых рэчываў у складзе сцёкавых вод. Гэты працэс адсочвае Рэспубліканскі цэнтр аналітычнага кантролю ў галіне навакольнага асяроддзя Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь. Фактаў перавышэння дапушчальных канцэнтрацый забруджвальных рэчываў на выпуску ў раку за мінулы год і тры месяцы гэтага ён не ўстанавіў. Не было іх выяўлена і падчас абследаванняў ракі ў раёне пасёлка Пашкава сёлета ў сакавіку. Што датычыцца будаўніцтва жылых дамоў вакол Дубравенкі, то, як паведамляецца ў афіцыйным лісце, гэтае пытанне было разгледжана яшчэ на этапе праектавання горадабудаўнічых праектаў агульнага і дэталёвага планавання. «Забудова тэрыторыі ўздоўж ракі Дубравенка прадугледжана рашэннямі горадабудаўнічага праекта агульнага планавання «Генеральны план Магілёва (карэкціроўка)», зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 красавіка 2017 года № 128 і горадабудаўнічым праектам «Дэталёвы план цэнтральнай часткі Магілёва з праектам рэгенерацыі гістарычнай зоны. Карэкціроўка» ад 17 студзеня 2017 года, які зацвердзіў сваім рашэннем № 3-5 Магілёўскі гарвыканкам.

Адзначаецца таксама, што дэталёвы план прадугледжвае будаўніцтва ў раёне ракі Дубравенкі трох шматкватэрных дамоў, адзін з якіх будзе з падземнай аўтастаянкай, а другі з убудаваным гаражом-стаянкай. Са спасылкай на «Гарводаканал» гаворыцца, што падключэнне вышэйазначаных аб'ектаў будзе ажыццяўляцца ў калектар дыяметрам, які ўжо існуе, 500 мм. Удакладняецца таксама, што на калектарах дыяметрам 350 і 500 мм, размешчаных у раёне дома № 32 па вуліцы Левая Дубравенка, за апошнія дзесяць гадоў аварый не было.

ПАДАРОЖЖА ЎЗДОЎЖ РАКІ

Заяўнікі лічаць адказ, мякка кажучы, адпіскай, нежаданнем прыслухоўвацца да голасу народа. Каб разабрацца ў праблеме, рушым глядзець праблемныя месцы разам з Леанідам Платоненкам і Уладзімірам Рамашковым, які раней працаваў праекціроўшчыкам «Магілёўграмадзянпраекце», а з'яўляецца спецыялістам па водазабеспячэнні і каналізацыі аднаго з прыватных магілёўскіх прадпрыемстваў. Экскурсія пачынаецца зусім не ў цэнтры, дзе мы бачым глянцавы стан ракі, а з аднаго з яе прытокаў — Прысненскага ручая ў Казіміраўцы. Гэта той самы раён, дзе некалькі разоў за апошнія гады ў сезон вялікай вады і дажджоў вельмі моцна падтоплівала жылыя дамы, а ў падвалах, як кажуць месцічы, вада стаіць амаль круглы год. Мае гіды запэўніваюць, што гэта адбываецца ад ігнаравання ручая. Ён амаль цалкам цячэ пад зямлёй, але яго вельмі насычаюць тутэйшыя каналізацыйныя сцёкі, якія цякуць па паверхні ў межах яго рэчышча гэтага ручая. Пахі тут, мякка кажучы, моташлівыя... А зусім побач прыватныя жылыя дамы. Ёсць надзея, што хутка ўсё зменіцца, бо паблізу будуецца каналізацыйна-помпавая станцыя. Смярдзючы ручай знікае ў каналізацыйнай трубе пад дарогай. За дарогай таксама вядзецца будаўніцтва. Мэта — зрабіць адвод сцёкавых вод за межы Мінскай шашы. А гэта той самы напрамак, дзе знаходзіцца Пячэрскае вадасховішча, у складзе якога цячэ і рака Дубравенка. Мае суразмоўцы звяртаюць увагу на тое, што гэтыя работы павінны праводзіцца пад наглядам грамадскасці. Бо на шляху будаўніцтва знаходзяцца Пячэрскі лес і Пячэрскае вадасховішча.

— Водны кодэкс Рэспублікі Беларусь мог бы тут нам вельмі дапамагчы, — кажа Уладзімір Рамашкоў. — Ёсць такое паняцце — рэкрэацыйная зона адпачынку. У кодэксе агаворваецца, што сцёкавых вод бліжэй чым за кіламетр там быць не павінна. Але чамусьці ў нас рэкрэацыйнай зонай адпачынку з'яўляецца не ўсё Пячэрскае возера, а толькі пляж. І гэта няправільна. Бо пляж — гэта толькі частка возера, прычым вельмі папулярнага ў магіляўчан. Тое ж самае і з Пячэрскім лесапаркам. Чамусьці ў паркавую зону трапляе толькі кавалак гэтага цудоўнага лесу. Між тым за некалькі гадоў непадалёк ад яго ўзнік густанаселены жылы мікрараён «Спадарожнік». Чаму б побач з лесам, на месцы былога гадавальніка «Магілёўзелянбуда» не стварыць парк? У гэтым выпадку і падыходы да карыстання тэрыторыяй былі б іншыя.

— Мы жадаем, каб будаўніцтва інжынерных сетак па Прысненскім ручаі, які праходзіць праз Пячэрскі лес і ўпадае ў Дубравенку, праходзіла разам з добраўпарадкаваннем гэтай тэрыторыі. Калі гэта не зрабіць зараз, на добраўпарадкаванне тэрыторыі можна будзе забыцца. Тут павінны быць веласцяжынкі, пешаходная зона, а не стыхійнае развіццё на мяжы акультурвання і банальнага беспарадку, якія мы бачым, — звяртае ўвагу Леанід Платоненка.

— Каб абараніць Дубравенку ад забруджвання, яшчэ з часоў Савецкага Саюза быў зроблены каскад з трох азёр у раёне Пашкава, — адзначае Уладзімір Рамашкоў. — Нешта падобнае магчыма зрабіць і з боку Прысненскага ручая. Тут жа ўсё ўзаемазвязана. Наогул Дубравенку трэба пачаць ратаваць на ўчастку ад Пашкаўскіх азёр да Казіміраўскага лесу, пры гэтым не высякаць лес, а, наадварот, развіваць зялёны пояс вакол Магілёва.

Мы ідзём па Пячэрскім лесе ўздоўж Прысненскага ручая, які ўжо не здаецца ручаём, а нагадвае невялічкую рэчку. А вунь і Пячэрскае вадасховішча, з якога ў раёне пляжа выцякае Дубравенка. Потым пятляем па жылой забудове мікрараёна Мір-2 і зноў выходзім на нейкі забалочаны ручай у раёне Карабанаўкі. Гэта зноў шматпакутная Дубравенка. Якая ж яна тут чыстая, як сляза! Яшчэ адзін марш-кідок праз чыгунку — і мы амаль у цэнтры горада. Збоку засталася паля старога моста — таго самага, які разбурыла падчас патопу вясной 1942 года раз'юшаная Дубравенка. На сваім шляху яна змыла ўсё, што было пабудавана, разам з людзьмі. Ахвяры былі страшэнныя. Зараз Дубравенка падобная на бездапаможнае дзіця, уся такая лагодная і ўразлівая. Але ад таго, як да яе паставяцца, залежыць будучыня не толькі гэтай воднай артэрыі, але і самога горада. Застанецца яна яго ўпрыгажэннем або знікне пад зямлёй, ужо залежыць ад нас.

Зона адпачынку на Дубравенцы — любімае месца магіляўчан і турыстаў.

Сцёкі, якімі сілкуецца Пячэрскае вадасховішча.

Леанід Платоненка: падземным крыніцам, у адрозненне ад сцёкаў, цяжка трапіць у Дубравенку.

ПАДСТАВА ДЛЯ РОЗДУМУ

Падчас працы над матэрыялам у інтэрнэце на вочы трапіў цікавы дакумент Міністэрства аховы прыроды і навакольнага асяроддзя — ацэнка ўздзеяння на навакольнае асяроддзе (АУНА) рэспубліканскага прадпрыемства «Цэнтральны навукова-даследчы інстытут комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў» за мінулы год. Там гаворыцца, што аналіз інжынерных сетак і збудаванняў жылога раёна Казіміраўка паказаў, што сістэма дажджавой каналізацыі аказвае істотны ўплыў на экалагічны стан ракі Дубровенка і яе прытока — ручая Прысненскі ў межах горада Магілёва. Адзначаецца значны знос сетак, нізкая прапускная здольнасць, недастатковая развітасць сістэмы дажджавой каналізацыі. Таксама дакумент сцвярджае, што, у адрозненне ад іншых абласных цэнтраў Рэспублікі Беларусь, для Магілёва характэрна значная колькасць выпускаў калектараў дажджавой каналізацыі ў малыя вадасцёкі без ачысткі, а таксама наяўнасць значнай колькасці прыватнай жылой забудовы ў басейнах малых вадасцёкаў, у тым ліку ў басейне ракі Дубравенка.

* * *

Праблема невялікай магілёўскай ракі для гараджан настолькі актуальная, што з ёй яны звярнуліся да кіраўніка краіны падчас правядзення акцыі «Задай пытанне Прэзідэнту». Ці будуць прынятыя меры па «лячэнні» Дубравенкі? «Звязда» будзе сачыць за развіццём падзей.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Таямніцы сталіцы

Лясныя сланы, уцалелая спадчына і сучасныя тэхналогіі...

А яшчэ гісторыя Першамайскага раёна непарыўна звязана з гісторыяй «Звязды»

Сёлета Першамайскі раён сталіцы адзначае сваё 50-годдзе. Як заўважыў **старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір ГУСАКОЎ,** сёння гэта частка Мінска з высокай канцэнтрацыяй творчых ідэй, найноўшых ведаў і высокіх тэхналогій. На тэрыторыі Першамайскага раёна размешчаны чатыры з сямі акадэмій (Акадэмія навук са шматлікімі ўстановамі і інстытутамі, Ваенная, Паслядыпломнай адукацыі, і мастацтваў). Тут знаходзіцца каля 250 буйных і сярэдніх прадпрыемстваў, выпускаецца інавацыйная прадукцыя. «За мінулы год аб'ём экспарту тавараў ведамаснымі арганізацыямі раёна перавысіў 372 мільёны долараў і павялічыўся прыблізна ў паўтара разы ад узроўню папярэдняга года», — паведаміў **кіраўнік адміністрацыі Першамайскага раёна Ігар КУДРЭВІЧ.** Знешні гандаль раён наладзіў са 154 краінамі. Мясцовыя тавары ідуць на экспарт у 94 краіны, прычым геаграфія паставак з кожным годам пашыраецца: пра беларускую прадукцыю ведаюць у Пакістане, Чылі, Тунісе, Ліберыі, Конга, Катары, на Філіпінах, у Люксембургу і іншых месцах.

За 2018 год аказана паслуг па экспарце прыкладна на мільярд долараў ЗША, ці 126 працэнтаў ад узроўню 2017 года. За першы квартал бягучага года экспартавана паслуг на 246 мільёнаў долараў. У структуры экспарту найбольшую долю займаюць камп'ютарныя, тэлекамунікацыйныя, інфармацыйныя паслугі (больш за 63 працэнты). Наогул, як заўважыў Ігар Кудрэвіч, за апошнія пяць гадоў экспарт паслуг раёна вырас больш чым у два разы.

Не дзіва, што менавіта ў Першамайскім раёне самыя высокія заробкі па краіне ў сярэднім больш за дзве тысячы рублёў, бо тут зарэгістраваны Парк высокіх тэхналогій, у склад якога ўваходзіць каля 500 кампаній з колькасцю работнікаў больш за 45 тысяч чалавек, якія займаюцца распрацоўкай праграмных прадуктаў і паслуг для кліентаў з больш чым 67 краін свету...

Падарожжа ў часе

Падчас навукова-практычнай канферэнцыі «Першамайскі раён г. Мінска: гісторыя, культура, людзі», што адбылася ў Акадэміі навук, можна было не толькі даведацца пра сучаснае жыццё адміністрацыйнай адзінкі і пазнаёміцца з яе найлепшымі навучэнцамі і студэнтамі (тут былі ўзнагароджаны лаўрэаты спецыяльнага фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адоранай моладзі). Установы культуры і адукацыі, прадпрыемствы дзяліліся сваімі дасягненнямі, а вучоныя Інстытута гісторыі НАН запрасілі ўсіх прысутных у віртуальнае падарожжа ў часе і прасторы, падчас якога можна было даведацца шмат новага пра тое, што раней адбывалася на гэтай тэрыторыі. 105 тысяч гадоў таму тут, напрыклад, гулялі... лясныя сланы. Пра гэта сведчаць косткі, знойдзеныя падчас будаўнічых работ і перададзеныя навукоўцам.

У XVI—XVIII стагоддзях землі сучаснага Першамайскага раёна былі прыватнаўласніцкімі і адносіліся не да Мінска, а да маёнтка Смалявічы. Першы вядомы населены пункт у гэтай мясцовасці — сяло Слепня. У старажытных дакументах згадваюцца колькасць насельніцтва, памеры сядзіб сялянскіх двароў і чым займаліся людзі. Так, тут былі млын і карчма — такія пабудовы аказаліся запатрабаванымі, бо недалёка знаходзіўся Мінск. У першай палове XVII стагоддзя Слепня была буйным, добра развітым населеным пунктам. Пазней ёй давялося прайсці праз заняпад, але сяло аднавілася, і ў канцы XVIII стагоддзя Слепня займала шэсць валок. Тут было 10 дамоў, 60 жыхароў (для параўнання: ваколіца Зялёны Лог — 4,5 валокі, чатыры дамы, 18 жыхароў, вёска Уручча — 10 валок, два дамы, 19 жыхароў, слабада Камароўка — 10 дамоў і 34 жыхары).

А заўтра была вайна

Пазнаёміцца з жыццём Мінска ў 1938—1945 гадах запрасіла **старшы навуковы супрацоўнік аддзела ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Ірына ВАРАНКОВА.**

— Першае раяніраванне Мінска праведзена па рашэнні цэнтральнага выканаўчага камітэта Беларускай ССР 17 сакавіка 1938 года, калі насельніцтва сталіцы дасягнула больш чым 244 тысяч чалавек, — паведаміла Ірына Юр'еўна. — Было створана тры адміністрацыйныя раёны: самы буйны — Варашылаўскі (названы ў гонар народнага камісара) з колькасцю насельніцтва больш за 104 тысяч чалавек, Кагановіцкі раён з насельніцтвам больш за 70 тысяч чалавек і Сталінскі з насельніцтвам больш за 60 тысяч. Варашылаўскі раён можна лічыць папярэднікам сучаснага раёна.

Да вайны горад заканчваўся ў раёне парка Чалюскінцаў, а цэнтральнай часткай Мінска ў той час лічылі тэрыторыю, дзе сёння знаходзіцца плошча Якуба Коласа

(да 1956 года яна называлася Камароўскай плошчай, а мінчане часцей яе звалі «Камароўскімі віламі»). Ірына Юр'еўна запрасіла на віртуальную экскурсію па паўночна-ўсходняй частцы Варашылаўскага раёна — туды, дзе размяшчаецца сучасны раён-юбіляр. У 1929—1931 гадах тут былі ўзведзены будынкі бальніцы, да вайны вядомыя як клінічны гарадок. Ён не пацярпеў ад бамбардзіровак у пачатку Вялікай Айчыннай, і таму сюды паступалі параненыя асколкамі людзі і тыя, хто атрымаў апёкі ў пажарах. Але калі Мінск быў акупаваны, немцы размясцілі тут свой ваенны шпіталь, які функцыянаваў да чэрвеня 1944 года і прымаў нямецкіх салдат і афіцэраў, параненых пад Масквой, Сталінградам, Курскам і інш. Побач з клінічным гарадком немцы арганізавалі могілкі, дзе хавалі тых, каго ўрачам не ўдалося выратаваць. Могілкі паступова разрасталіся, займалі тэрыторыю, дзе сёння стаіць кінатэатр «Кастрычнік», ішлі ўздоўж карпусоў Акадэміі навук. Але ў 1943 годзе немцы перанеслі пахаванні за межы горада. Пасля вызвалення Мінска клінічны гарадок стаў прымаць параненых савецкіх салдат. Да нашага часу захавалася некалькі яго карпусоў.

У межах сучаснай вуліцы Сурганава размяшчаўся Усебеларускі стадыён (адкрыты ў 1930 годзе), які ўмяшчаў 10 тысяч гледачоў. Ён быў асноўнай спартыўнай пляцоўкай краіны (пакуль не адкрылі стадыён «Дынама»). У гады акупацыі ён прыйшоў у заняпад, вяртаць яго да спартыўнага жыцця не сталі, але і землі доўга не чапалі, тэрыторыя была забудавана толькі ў 1967 годзе.

У 1930 годзе ў Мінску пачалі будаваць Акадэмічны гарадок, у 1935-м увялі першы будынак, дзе зараз знаходзіцца Інстытут фізікі, у 40-м годзе завяршылі будаўніцтва галоўнага корпуса Прэзідыума Акадэміі. У апошнім у пачатку акупацыі гітлераўцы размясцілі свае воінскія часці. Моцна пацярпеў галоўны корпус падчас баёў за вызваленне Мінска ў ліпені 1944, але пасля гэты прыгожы будынак быў адноўлены.

Насупраць галоўнага корпуса Акадэміі стаіць стары будынак Дома друку. Пабудаваны ён у 1935 годзе. Тут знаходзілася найбуйнейшае паліграфічнае прадпрыемства Беларусі, абсталяванне якога ў гады вайны немцы выкарыстоўвалі ў сваіх мэтах. Але ўдзельнікі адной з падпольных груп — друкарскія наборшчыкі Свірыдаў і Пупко ў пачатку мая 1942 года набралі тут першы нумар падпольнай газеты «Звязда»! Уявіце, у якое шаленства прыйшлі акупанты, калі ўбачылі нумары падпольнай газеты. І гэта пасля масавых распраў, калі яны збіраліся рапартаваць пра тое, што падполле ў Мінску знішчана...

Ёсць яшчэ адна драматычная старонка ў гісторыі былога Варашылаўскага раёна, якая таксама звязана з газетай «Звязда». Раней у межах сучасных вуліц Сурганава, Калініна і тэрыторый уздоўж праспекта Незалежнасці да плошчы Якуба Коласа размяшчаўся Камароўскі пасёлак, у 1937 годзе ў сувязі з вялікімі святкаваннямі дзён памяці Пушкіна яго назвалі Пушкінскім. Пасёлак быў забудаваны тыпавымі драўлянымі баракамі на 16 кватэр. (Дарэчы, асобныя дамы Пушкінскага пасёлка прастаялі да 1990-х гадоў). У гады вайны тут збіраліся падпольшчыкі, захоўвалася зброя і падпольная літаратура. Тут жыў рэдактар першага падпольнага нумара «Звязды» Уладзімір Амельянюк. У пасёлку знаходзілася і канспіратыўная кватэра аднаго з арганізатараў мінскага падполля Івана Кабушкіна, які пасмяротна атрымаў званне Героя Савецкага Саюза.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

ШЧЫРАЯ ВЕРА ДАПАМАГЛА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэта першы храм у Беларусі, прысвечаны святым, якія жылі ў нясцюдным для праваслаўнай царквы XX стагоддзі. Будучы храм з'явіцца на вуліцы Якубава. Цяпер там, у прыстасаваным памяшканні былога дзіцячага садка, размяшчаецца царква ў гонар іконы Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць». На працягу васямнаццаці гадоў тут дзейнічае духоўна-асветніцкі цэнтр, у якім не толькі праходзяць праваслаўныя набажэнствы, але і дзейнічаюць біблейска-багаслоўскія курсы, праходзяць заняткі нядзельнай школы і фотаклуба, выдаецца тэматычны часопіс.

Будаўніцтва новага храма ініцыяваў архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі Сцяфан. Цяпер ужо пабудавана цокальная частка храма. Па словах **настаяцеля храма, протаіерэя Вадзіма КАЧАНА,** зрабіць свой унёсак у будаўніцтва можа любы ахвотны:

— Імя ахвярадаўцы наносіцца на цэглу, якая потым будзе закладзена ў сцены храма. Між тым частка мошчаў святіцеля Іаана Шанхайскага і Сан-Францыскага з'явілася на прыходзе яшчэ за некалькі год да таго, як было распачата будаўніцтва. Прыхаджане царквы ў гонар іконы Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць» пераехалі жыць у Амерыку. Яны паспрыялі таму, што ў 2010 годзе ў Гомель перадалі частку мошчаў святіцеля.

Дарэчы, мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел восем гадоў нёс царкоўны послух у Амерыцы. Ён узгадаў, як складана ў 1992 годзе было трапіць да мошчаў святіцеля Іаана:

— У першы год, калі я прыехаў у Сан-Францыска, святіцель Іаан Шанхайскі толькі нядаўна быў услаўлены і знойдзены яго мошчы. Яны знаходзіліся ў кафедральным саборы. Але ў той час у нас былі вельмі складаныя ўзаемаадносіны з замежнай праваслаўнай Царквой, — мы не мелі афіцыйных стасункаў, і нас нікуды не пускалі. Я вельмі хацеў падысці да мошчаў святіцеля Іаана, але мяне папярэдзілі, што гэта будзе вельмі складана. Мы прыехалі, і нечакана для нас былі адкрытыя вароты ў храм. Мы падышлі і прыкладаліся да мошчаў. У маёй памяці дагэтуль захоўваецца тая сустрэча са святіцелем Іаанам. З часам Бог так уладкаваў, што цярпеннем, пакорай нашага народа, шчырай верай людзей мы прымірыліся з той часткай, якая доўгі час была адрынута ад нашай Царквы. Сёння мы разам, і радасць вялікая, таму што пераадолены такі вялікі падзел. Святіцель Іаан Сан-Францыскі шчыра ўсіх заклікаў мець стасункі, шчыра маліўся пра аб'яднанне Царквы. Таму і мы павінны набірацца цярпення, шчырай веры ў сэрцы, пераадольваць варожасць і нянавісць, мець сапраўдную хрысціянскую любоў. Тады і Хрыстос будзе з намі. Калі будзе аднадумства, згода, малітва ды любоў хрысціянская — і храм гэты пабудуем, і ў сэрца кожнага чалавека Бог дапаможа пакласці падмурак царства Божага ўнутры нас.

Ірына АСТАШКЕВІЧ, фота аўтара.

Извещение об открытом аукционе по продаже права заключения договора аренды земельного участка для строительства объекта в городе Гродно 9 июля 2019 года

№ лота	Наименование объекта	Местонахождение объекта	Площадь земельного участка, (га)	Кадастровый номер	Начальная цена, руб.	Сумма задатка, руб.	Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации, руб.	Условие продажи и целевое назначение земельного участка
1*	Право аренды земельного участка сроком на 25 лет	Улица Рыбацкая, территория, прилегающая к жилому дому № 14	0,5800	440100000002006611	198 315,52	20 000,00	3 298,67	Строительство объекта общественного назначения: здание по индивидуальному проекту 2-этажное (возможно с мансардным этажом) с помещениями оздоровительного и спортивно-оздоровительного назначения и расширенным сервисом услуг

* – земельный участок имеет ограничения.

Победитель аукциона обязан:

в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года;

приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года – гражданину;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, возместить расходы по подготовке документации для проведения аукциона.

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

Аукцион состоится 9 июля 2019 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1.

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 407, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 10 июня по 4 июля 2019 года**. Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-00-10**. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

Технический администратор доменных зон .БЕЛ и .BY ООО «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ» сообщает о проведении благотворительных аукционов на регистрацию доменных имен, исключенных из реестра. Средства от аукциона, кроме стоимости услуг по регистрации доменного имени и налогов, будут направлены на поддержку учреждений для детей-сирот, детей, оставшихся без попечения родителей, детей-инвалидов, детей с особенностями психофизического развития.

Предметом аукциона являются доменные имена в доменных зонах .БЕЛ и .BY, исключенные из реестра. Перечень доменных имен, предлагаемых к регистрации по результатам аукциона, размещается на сайте https://auction.cctld.by

Даты проведения аукционов в период с июля по декабрь 2019 г.:

дата начала июльского аукциона доменов – 15 июля 2019 г., дата окончания аукциона – 17 июля 2019 г.

Дата начала августовского аукциона доменов – 12 августа 2019 г., дата окончания аукциона – 14 августа 2019 г.

Дата начала сентябрьского аукциона доменов – 9 сентября 2019 г., дата окончания аукциона – 11 сентября 2019 г.

Дата начала октябрьского аукциона доменов – 14 октября 2019 г., дата окончания аукциона – 16 октября 2019 г.

Дата начала ноябрьского аукциона доменов – 11 ноября 2019 г., дата окончания аукциона – 13 ноября 2019 г.

Дата начала декабрьского аукциона доменов – 9 декабря 2019 г., дата окончания аукциона – 11 декабря 2019 г.

Время начала аукциона – 12.00 даты начала аукциона, время окончания аукциона – 12.00 даты окончания аукциона. В случае если в течение последних 2 минут до окончания аукциона была сделана ставка, срок проведения аукциона автоматически продлевается еще на 5 минут.

Аукцион проводится на интернет-ресурсе https://auction.cctld.by

В отношении каждого доменного имени, являющегося предметом аукциона, размещается программная форма, позволяющая участникам аукциона делать ставки.

Участниками аукциона могут быть юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, являющиеся резидентами или нерезидентами Республики Беларусь. Для участия в аукционе участник должен пройти регистрацию на сайте https://auction.cctld.by

Прием ставок прекращается по истечении 2 календарных дней после начала аукциона по каждому доменному имени.

Аукцион считается состоявшимся при наличии хотя бы одной ставки.

Победившим в аукционе считается тот участник, который сделал максимальную ставку к моменту окончания аукциона.

Текст Положения о порядке проведения аукциона на регистрацию доменных имен находится на сайте https://auction.cctld.by в разделе «Правила проведения аукционов»

Организатор аукциона: ООО «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ», УНП 100160363, e-mail: au@hoster.by

Тел. организатора +375 17 239 57 02.

Тел. комиссии по организации и проведению аукциона +375 17 239 57 77

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 18 июля 2019 года проводит 1А повторный открытый аукцион по продаже имущества

Номера лотов	Наименование имущества	Год выпуска	Начальная цена торгов, бел. руб. (без учета НДС)	Сумма задатка, бел. руб.
1	Автомобиль TOYOTA CAMRY, инв. № 521	2008	12 000,00	1 200,00
2	Автомобиль KIA CEED, инв. № 526	2009	12 160,00	1 216,00

Место нахождения имущества: г. Минск, ул. Калиновского, 8.

Имущество, выставленное на аукцион, находится в республиканской собственности и хозяйственном ведении ГВТУП «Белспецвнештехника».

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, 18 июля 2019 г. в 11.00.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительные и другие необходимые документы до 15.00 16 июля 2019 года.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 18 июля 2019 г.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней, нерезиденты Республики Беларусь – в течение 10 банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

3. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем (единственным участником) по фактическим затратам не позднее следующего дня после их проведения.

4. РУП «Белспецконтракт» имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY51BPSB30121078830299330000, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-СберБанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп. 1, код BPSBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва, № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России № 30101810400000000225. Без НДС.Справки по тел./факс (017) 398 05 41. Ранее опубликованное извещение в газете «Звязда» № 53 от 21 марта 2019 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 18 июля 2019 года проводит 2 А открытый аукцион по продаже имущества

Номера лотов	Наименование имущества	Год выпуска	Начальная цена торгов, бел. руб. (без учета НДС)	Сумма задатка, бел. руб.
1	Автомобиль ГАЗ-2705-435, инв. № 60062	2004	2 162,52	216,25
2	Автомобиль УАЗ-3909, инв. № 60061	2004	1 952,87	195,29
3	Автомобиль ГАЗ-2705, инв. № 60102	2006	2 268,20	226,82
4	Станок токарно-винторезный, инв. № 30042	1998	769,72	76,97

Место нахождения имущества: г. Минск, пер. Домашевский, 11.

Имущество, выставленное на аукцион, находится в республиканской собственности и хозяйственном ведении РУП «Белдорцентр».

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, 18 июля 2019 г. в 11.30.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительные и другие необходимые документы до 15.00 16 июля 2019 года.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 18 июля 2019 г.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней, нерезиденты Республики Беларусь – в течение 10 банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

3. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем (единственным участником) по фактическим затратам не позднее следующего дня после их проведения.

4. РУП «Белспецконтракт» имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY51BPSB30121078830299330000, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-СберБанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп. 1, код BPSBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва, № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России № 30101810400000000225. Без НДС. Справки по тел./факс (017) 398 05 41.

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытого аукциона по продаже находящегося в государственной собственности имущества с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, определенной законодательством

Организатор аукциона: комитет государственного имущества Минского городского исполнительного комитета, г.Минск, ул. Герцена, 2А, каб. 2, тел.: (017) 289 11 27, (017) 200 20 89, (017) 222 44 69.

Аукцион состоится **10 июля 2019 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

На аукцион выставляется:

Сведения о предмете аукциона, местонахождение предмета аукциона	Незавершенные незаконсервированные капитальные строения, расположенные по ул. Корженевского, 18Б, 18Б/1, 18Б/2, 18Б/3, 18Б/4, 18Б/5 в г. Минске: – незавершенное незаконсервированное капитальное строение по ул. Корженевского, 18Б: общая площадь строения 9280,5 кв.м; фундамент – железобетонный свайный; стены – железобетонные блоки, кирпичные; перегородки – кирпичные; перекрытия – железобетонное; кровля – плоская, мягкая рулонная; проемы – деревянные; готовность строения – 50 %; – незавершенное незаконсервированное капитальное строение по ул. Корженевского, 18Б/1: общая площадь строения 287,6 кв. м; фундамент, перекрытия, полы – железобетонные, стены – железобетонные блоки; перегородки – кирпич; кровля – плоская, рубероидная; готовность строения – 33 %; – незавершенное незаконсервированное капитальное строение по ул. Корженевского, 18Б/2: общая площадь строения 265, 3 кв. м; фундамент, каркас, перекрытия – железобетонные; стены – железобетонные, кирпичные; кровля – плоская, рубероидная; полы – бетонные; готовность строения – 73 %; – незавершенное незаконсервированное сооружение (блок усреднителей) по ул. Корженевского, 18Б/3: площадь застройки 883 кв. м; фундамент, стены, перекрытия – железобетонные, крыша – плоская, рубероидная; черновой пол – бетонный; готовность сооружения – 36 %; – незавершенное незаконсервированное сооружение (блок резервуаров) по ул. Корженевского, 18Б/4: площадь застройки 1640 кв. м; фундамент, стены, перекрытия – железобетонные; крыша – плоская, рубероидная; черновой пол бетонный; готовность сооружения – 44 %; – незавершенное незаконсервированное сооружение (проходной тоннель) по ул. Корженевского, 18Б/5: площадь застройки 744 кв. м; фундамент – железобетонный свайный; перекрытия, стены – железобетонные; полы – бетонные; готовность сооружения – 47 %
Начальная цена предмета аукциона	6 базовых величин
Продавец	Республиканское унитарное поизводственное предприятие «БЕЛМЕДПРЕПАРАТЫ», конт. тел. (017) 220 39 76. Осмотр имущества потенциальными покупателями производится с участием представителя продавца Мельника Павла Владимировича – тел.: (017) 220 39 76, (44) 795 73 24
Обязательные условия аукциона	– Осуществление покупателем предпринимательской деятельности с использованием имущества и (или) построенных новых объектов в случае сноса имущества либо отдельных объектов, входящих в состав имущества, в течение пяти лет, начиная не позднее двух месяцев с момента ввода в эксплуатацию, с учетом разработки и утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство (реконструкцию) имущества не позднее двух лет со дня согласования покупателем функционального назначения имущества и начала строительства (реконструкции) не позднее шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство (реконструкцию); – запрет покупателю на отчуждение имущества до выполнения им условий договора купли-продажи
Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета	6 базовых величин до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с BY13AKBB36429000008700000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г.Минск, код AKBBBY2X, УНП 100048181 комитета государственного имущества Минского городского исполнительного комитета. Назначение платежа – **задаток для участия в аукционе**
Информация о земельном участке	Земельный участок площадью 1,8573 га с кадастровым номером 500000000004001193. Срок аренды – 5 лет со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона, либо признании аукциона несостоявшимся. Направление возможного использования земельного участка – в соответствии с градостроительным проектом детального планирования территории в границах ул. Лейтенанта Кижеватова – МКАД – ул. Казинца – ул. Корженевского, утвержденным решением Мингорисполкома от 07.09.2017 № 3002, территория земельного участка предусмотрена под инвестиционную площадку производственного назначения (реконструируемая (проектируемая)). Разработан градостроительный паспорт для размещения объекта производственного назначения
Условия, предусмотренные в решении о предоставлении земельного участка победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона	– обратиться в установленном порядке в Мингорисполком с заявлением о предоставлении земельного участка с кадастровым номером 500000000004001205; – обеспечить проезд транспортных средств ОАО «Интеграл» – управляющая компания холдинга «Интеграл» по существующему подъездному пути, находящемуся на праве общего долевого постоянного пользования у РУП «Белмедпрепараты» и ОАО «Интеграл» – управляющая компания холдинга «Интеграл»; – в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него; – обеспечить пользование предоставленным земельным участком в соответствии с целевым назначением и условиями его предоставления, осуществлять комплекс мероприятий по охране земель; – вносить арендную плату в соответствии с действующим законодательством; – при продлении срока аренды земельного участка до истечения срока аренды обратиться в установленном порядке за государственной регистрацией продления права; – земельный участок, предоставленный в аренду, по миновании надобности, но не позднее срока, на который он предоставлен, возвратить в состав земель города Минска в состоянии, пригодном для дальнейшего использования по назначению, путем направления в Мингорисполком соответствующего ходатайства или в случае необходимости продлить срок аренды им, обратившись в Мингорисполком не позднее, чем за три месяца до окончания установленного срока

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже находящегося в государственной собственности недвижимого имущества с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, определенной законодательством, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11.03.2010 № 342.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, ул. Герцена, 2А, каб. 2, по рабочим дням с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений – 8 июля 2019 г. до 16.00.

К участию в аукционе допускаются: негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные юридические лица.

Для участия в аукционе организатору аукциона подается заявление на участие в аукционе по установленной форме, к которому прилагаются следующие документы:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона и выполнить условия, предусмотренные в решении о предоставлении земельного участка победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка. Размер возмещаемых затрат доводится до сведения участников аукциона до начала его проведения.

После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий и представления организатору аукциона, продавцу и в Минский городской исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи предмета аукциона. В тот же срок Минский городской исполнительный комитет заключает с победителем аукциона (претендентом на покупку) договор аренды земельного участка.

Информация об объявленном аукционе и предмете аукциона дополнительно размещена на официальных интернет-порталах Минского городского исполнительного комитета (www.minsk.gov.by) и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (www. gki.gov.by).

Супраць залежнасці

У ІНТЭРНЭТ-ІЗАЛЯЦЫІ

Тры дні беларускія сем'і пражылі без гаджэтаў і... перагледзелі сваё стаўленне да іх

У Беларусі правялі сацыялагічнае даследаванне «Тры дні без гаджэтаў», падчас якога высвятлялі, чым іх можна замяніць і ці сталі сем'і больш шчаслівыя без электронных прылад. Апытанне паказала: амаль 70 % удзельнікаў прызналі сваю залежнасць, але ж многія ў выніку змянілі сваё стаўленне да гаджэтаў. А псіхіятры, якія прааналізавалі вынікі даследавання, канстатуюць, што інтэрнэт-залежнасць усё больш паглынае моладзь і падлеткаў і гэта выклікае шмат праблем у псіхічным здароўі.

У даследаванні прынялі ўдзел беларускія сем'і з дзецьмі да трох гадоў, дзе адзін з бацькоў знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку. 29 % сем'яў прадстаўлялі вёскі (малыя гарады) і Мінск, 42 % удзельнікаў — абласныя цэнтры і буйныя гарады.

— На наш заклік першапачаткова адгукнулася больш за 500 сем'яў, але, усвядоміўшы, што давядзецца цалкам адмовіцца ад гаджэтаў на тры дні, на эксперымент пагадзілася толькі 10 % — 65 сем'яў, — расказвае **Аляксандр ЛЯЎКОВІЧ, намеснік дырэктара кампаніі «Лыжка ў далоньцы»**, якая стала арганізатарам праекта. — Да канца іспыту дайшлі 52 сям'і, а 13 адсеяліся ў працэсе.

Сваё рашэнне выйсці з праекта ўдзельнікі аргументавалі па-рознаму. Вось адказ адной з жанчын, якая не вытрымала ізаляцыі ад сусветнага павуцiння: «У інтэрнэце я слухаю музыку, гляджу прагноз надвор'я, кантактую. Без гэтага сёння жыць немагчыма».

Да эксперымента 88 % матуль праводзілі ў інтэрнэце да шасці гадзін штодзень, астатнія — сем і больш. Бацькі — амаль столькі ж, і толькі 10 % з іх — менш за гадзіну. На чытанне кніг выдаткоўвалася ў сярэднім 18 хвілін. Сярэдні ўзрост дзяцей у сем'ях удзельнікаў — паўтара года, і такія дзеці не спяць каля васьмі гадзін у суткі. Каля гадзіны штодзень у гаджэтах праводзіла 60 % малых, ад дзвюх да шасці гадзін — 37 %. І калі ў матуль асноўны дэвайс, якім яны карыстаюцца, — мабільны тэлефон, то ў дзяцей — тэлевізар. Большасць жанчын — 92 % — наведвалі сацыяльныя сеткі, 74 % глядзелі фільмы, 6 % — відэа.

Падчас эксперымента, калі ад гаджэтаў давялося цалкам адмовіцца, сем'і прызнаваліся, што ў іх павялічыўся час на прагулкі, наведванне сяброў і блізкіх, на іншыя справы. «Аказваецца, што дзень даўжэйшы», «Паспела пафарбаваць пазногці», — дзяліліся ўдзельніцы. У цэлым жа відавочным стаў той факт, што абмежаванае карыстанне электроннымі прыладамі паляпшае адносіны ў сям'і.

— Вуснае апытанне паказала, што многія ўдзельнікі змянілі сваё стаўленне да гаджэтаў, — падвёў вынікі Аляксандр Ляўковіч. — Некаторыя прызнаваліся, што дзякуючы эксперыменту асэнсавалі, як шмат часу губляюць на сядзенне ў інтэрнэце і колькі цікавых заняткаў з дзецьмі прапускаюць. А іншыя ўвогуле задумваюцца над тым, каб перыядычна практыкаваць дні без гаджэтаў у сваёй сям'і. 32 % удзельнікаў не змянілі сваё стаўленне, праўда, сярод іх былі і тыя, у каго першапачаткова яно было адмоўнае. А 68 % прызналі сваю залежнасць.

— Прызнанні некаторых бацькоў падчас даследавання ўражваюць. Дзеці да трох гадоў увогуле не павінны карыстацца гаджэтамі. Мультфільмы ў такім узросце можна глядзець 5—10 хвілін, ні ў якім разе не больш за паўгадзіны, — кажа **кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт, загадчык аддзела псіхічных і паводзінных расстройстваў РНПЦ псіхічнага здароўя Міхаіл ВАЖЭНІН.** — Нядаўна ў нас быў 14-гадовы падлетак з простай формай шызафрэніі. Маці ў тры гады пасадзіла яго за камп'ютар. У восем ён ужо не мог наведваць школу. А ў 14 гадоў гэта была цалкам разбураная асоба.

Спецыяліст папярэджвае, што камп'ютарная залежнасць у дашкольным узросце вядзе да слабасці розуму, рассеянай увагі, гіперактыўнасці. І такія праблемы праяўляюцца не адразу, а калі дзіця ідзе ў школу. Да пяці гадоў малое не павінна мець ніякіх гаджэтаў, акрамя кнопачнага мабільнага тэлефона, упэўнены эксперт.

Міхаіл Важэнін прывёў і вынікі іншага даследавання, якое праводзілася ў Беларусі па дыягностыцы інтэрнэт-залежнасці ў падлеткаў і моладзі. Яе маюць 16 % падлеткаў. Прычым у 2 % гэта цяжкія формы з сур'ёзнымі псіхічнымі парушэннямі. У 6—7 % лёгкая ступень, пры якой дастаткова правільнага адукацыйнага падыходу. У астатніх інтэрнэт-залежнасць умеранай ступені, якая патрабуе псіхатэрапіі. Сярод моладзі 18—29 гадоў залежных ад інтэрнэту яшчэ больш — 19,8 %. Дарослым спецыяліст не рэкамендуе праводзіць у гаджэтах больш чым 2—4 гадзіны.

— Праграміст трое сутак прасядзеў за камп'ютарам. У выніку ў яго развіўся востры псіхоз, — кажа Міхаіл Важэнін. — Людзі, якія маюць генетычную схільнасць да псіхічных расстройстваў, праз злоўжыванне часам, праведзеным за камп'ютарам, атрымліваюць шкодныя наступствы для свайго псіхічнага здароўя. Гэта нашы патэнцыяльныя пацыенты ў будучым.

— Дзеці, якія шмат часу праводзяць у гаджэтах, развіваюцца не зусім правільна, мова ў іх фарміруецца горш, яны, калі казаць проста, крыху глухія, крыху слепыя, хоць гэта і вельмі разумныя дзеці, — працягвае **медыцынскі псіхолаг дзіцячага псіхіятрычнага дыспансера г. Мінска Аліна ШЫЛАВА.** — Для нармальнага развіцця дзіцяці неабходна кантактаванне — з людзьмі рознага полу, узросту і сацыяльных груп. Выцясненне зносінаў на карысць гаджэтаў фарміруе развіццё замкнёнасці і вялікай колькасці страхаў. Да таго ж гульня ў камп'ютары не развівае здольнасць працаваць. Калі дарослы можа адкласці планшэт і пайсці выконваць нейкую справу, то дзіця яшчэ не валодае такім развітым пачуццём адказнасці, яно не можа пакінуць гаджэт. Так забава пачынае займаць цэнтральнае месца ў яго жыцці.

Спецыялісты раяць не забываць, што менавіта бацькі адказныя за выхаванне дзіцяці. Устанаўліваць праграмы бацькоўскага кантролю, абмяжоўваць час карыстання камп'ютарам і смартфонам, займацца з дзецьмі, адцягваць увагу гульнямі і прагулкамі, памятаць, што схільнасць да актыўнага ладу жыцця і фізічных нагрузак фарміраваць трэба з дзяцінства, — асноўныя парады, каб пазбегнуць інтэрнэт-залежнасці.

— Калі ж вы ў прынцыпе не хочаце займацца выхаваннем сваіх дзяцей, то, магчыма, камп'ютар ці смартфон — не горшая альтэрнатыва, — рэзюмуе Аліна Шылава. — Але і не лепшая.

Алена КРАВЕЦ.

Фестывалім!

Галоўная тэма Купалля — малая радзіма

Чым парадуе рэспубліканскі фестываль «Александрыя збірае сяброў — 2019»?

Да вялікага купальскага свята яшчэ больш за месяц, але падрыхтоўка ўжо распачатая. Пройдзе яно 6—7 ліпеня на традыцыйнай маляўнічай лугавіне на беразе Дняпра, які нясе свае хвалі паміж аграгарадкамі Александрыя і Копысь. Як паведамілі ва ўпраўленні культуры Магілёўскага аблвыканкама, галоўная тэма сёлетняга фестывалю — трохгоддзе малой радзімы. У праграме як заўсёды канцэрты, гандаль на імправізаваных кірмашовых вуліцах, прэзентацыі рэгіянальных фестываляў і свят усіх рэгіёнаў краіны, начная маладзёжная дыскатэка, ушанаванне перадавікоў аграпрамысловага комплексу. Для ўдзелу ў вялікай выстаўцы-кірмашы і канцэртах запрошаны майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і творчыя калектывы з Беларусі, Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Польшчы, Эстоніі. Прадпрыемствы спажыўкааперацыі абяцаюць парадаваць шырокім асартыментам харчовых тавараў і разнастайнасцю страў беларускай і замежных кухняў. Не абыдзецца без папулярнай у народзе дэгустацыі. Сваімі прысмакамі і вырабамі парадуюць установы адукацыі і сацыяльнай абароны вобласці, якія прадэманструюць найлепшыя ўзоры дэкаратыўна-прыкладной і тэхнічнай творчасці, вырабленыя з гліны, саломкі, лазы, шкла, металу, дрэва, тэкстылю. Для моладзі будзе працаваць пляцоўка «Творчасць маладых», дзе юнакі і дзяўчаты змогуць прадэманстраваць свае спартыўныя, творчыя і навукова-тэхнічныя дасягненні. Аматарам цыркавых відовішчаў будзе цікава заглянуць на пляцоўку «Свята цырка ў Александрыі». А ахвотных паказытаць нервы запросяць паўдзельнічаць у гульні «лазертаг». Кульмінацыяй свята стануць купальскі гала-канцэрт і феерверк. Але гэтым справа не скончыцца. З раніцы зноў пачнуць працаваць гандлёвыя рады, а на галоўнай пляцоўцы адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўшанавання перадавікоў аграпрамысловага комплексу вобласці. Настрой ім будзе падымаць народны артыст Рэспублікі Беларусь Анатоль Ярмоленка і яго гурт «Сябры».

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Наш фармат

Агульную дыктоўку напісалі каля 1000 чалавек

У першы дзень лета ў Мінску прайшла ўжо трэцяя па ліку акцыя «Агульная дыктоўка», якая мае на мэце не столькі павышэнне пісьменнасці, колькі наогул папулярызацыю, павелічэнне сярод розных пакаленняў беларусаў цікавасці і павагі да роднай мовы.

Каб праверыць і ўдасканаліць свае веды, у канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі дыктоўку пісалі некалькі сотняў чалавек, ад школьнікаў да пенсіянераў. А многія далучыліся да акцыі дыстанцыйна — дзякуючы прамой трансляцыі на канале «Культура» Беларускага радыё. Агулам жа на дыктоўку сёлета зарэгістраваліся звыш тысячы чалавек па ўсёй краіне. Як адзначыла спецыяліст па карпаратыўных камунікацыях ААТ «Лідскае піва» Надзея Нікалаева (менавіта гэты брэнд выступіў заснавальнікам і арганізатарам сацыяльна-адукацыйнай акцыі), сёлетняя дыктоўка стала самай маштабнай: «І нам вельмі прыемна, што, нягледзячы на выхадны дзень і пачатак лета, колькасць удзельнікаў сацыяльнага праекта па падтрымцы беларускай мовы з кожным годам павялічваецца».

А галоўным героем дыктоўкі стаў... акцёр Купалаўскага тэатра Міхаіл Зуй. Зрэшты, гераяў было некалькі. Па-першае, філолаг, грамадска-палітычны дзеяч Мялецій Сматрыцкі — арганізатары прысвяцілі дыктоўку 400-годдзю ягонай «Граматыкі», што была выдадзена ў 1619 годзе ў Еўі, стала ўзорам для граматык некалькіх моў і цягам некалькіх стагоддзяў заставалася найбольш аўтарытэтным падручнікам па славянскім мовазнаўстве (нездарма Міхаіл Ламаносаў называў гэту кнігу «брамай вучонасці»). Па-другое, Андрусь Горват — пісьменнік і журналіст, чый раман-бестселер «Радзіва «Прудок» зрабіў, здаецца, немагчымае: прымусіў пакаленне «Z» чытаць па-беларуску, бо гэта крута і захапляльна. Па-трэцяе, Міхаіл Зуй — акцёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, які нароўні з многімі іншымі купалаўцамі стаў героем новага рамана Горвата «Прэм'ера». Урывак з яго і паслужыў асновай сёлетняй дыктоўкі. І, нарэшце, Арцём Лук'яненка і Ксенія Жук — папулярныя беларускія музыканты, удзельнікі гурта Naviband, дагэтуль адзіныя, хто прадставіў на роднай мове нашу краіну на міжнародным песенным конкурсе «Еўрабачанне». Яны выступілі не толькі ў ролі чытальнікаў тэксту, старанна падказваючы інтанацыяй усе незразумелыя моманты, але і ў звыклым для сябе спеўным амплуа, падарыўшы прысутным добры настрой і некалькі музычных кампазіцый.

Усе работы, у тым ліку напісаныя завочна і дасланыя арганізатарам па электроннай пошце, праверыць вопытная каманда філолагаў, прычым выпраўленні абяцаюць залічваць на карысць экзаменаваных. Вынікі «Агульнай дыктоўкі — 2019» стануць вядомыя пасля 8 чэрвеня, а «харашысты» і выдатнікі па традыцыі атрымаюць падарункі.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Вернісаж

Жыхар вёскі Купіск — мецэнат Навагрудка

З жыхаром вёскі Купіск Навагрудскага раёна Віктарам Залаціліным нашыя чытачы ўжо знаёмыя: амаль год таму ў «Звяздзе» і на сайце газеты быў апублікаваны матэрыял пад назвай «Залацілінскае лета». У артыкуле распавядалася пра незвычайны выбар жыццёвых каштоўнасцяў былога жыхара Мінска: прадпрымальнік і педагог вярнуўся ў родную вёску і стаў маляваць — не наракаючы на лёс і нягледзячы на малы рост (у дзяцінстве яго рост спыніўся). Віктар Залацілін стаў вядомым творцам — мастаком-жывапісцам.

Жыве творца ў дзедавай хаце, вядзе невялікую гаспадарку, апрацоўвае агарод. Хату прыстасаваў пад майстэрню, малюе навакольныя краявіды. Стварыў не менш за сотню палотнаў, на якіх увекавечыў прыгожыя станы прыроды Нёманскага краю. Амаль кожны год наладжвае персанальныя выстаўкі. Сваё самотнае жыццё дзеліць з чатырохногім сябрам па мянушцы Вольф з пароды нямецкіх аўчарак.

Сёлета Віктару пайшоў шэсцьдзясят чацвёрты год. Ён па-ранейшаму працавіты, можа днямі сядзець за мальбертам, даводзіць свае творы да дасканаласці. Час ад часу ідзе на нёманскі бераг, балазе, рака адразу за агародам, сядае ў лодку, пераплывае на супрацьлеглы бераг, шукае ў атачэнні прыроды адпаведныя свайму настрою аб'екты і матывы, робіць накіды будучых вобразаў. Калі я наведаў Віктара, ён заканчваў твор пра маляўнічы нёманскі куток *(на фота)*.

Напрыканцы мінулага года Віктар Залацілін падарыў Навагрудку калекцыю сваіх твораў — дваццаць найлепшых палотнаў, якія мастак ствараў на працягу апошніх дзесяці гадоў, упрыгожылі вестыбюльную залу другога паверха Дома культуры горада. Бліскучая падзея і для горада, і для самога творцы — сапраўдны царскі падарунак!

— Я люблю сваіх землякоў, не ўяўляю жыцця без Нёмана, Навагрудак стаў дарагім майму сэрцу горадам, — так проста выказаў матывы высакароднага ўчынку вясковы пенсіянер Віктар Залацілін. — Хто б я быў без сваёй малой радзімы!

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Гістарычны навігатар

ТАМ, ДЗЕ АЖЫВАЕ НАТХНЕННЕ

У Мірскім замку пройдуць «Кніжныя сустрэчы»

15 чэрвеня адбудзецца новы кніжны фестываль — і не дзе-небудзь, а ў Мірскім замку! Ён разгорнецца ў замкавым дворыку, а таксама на некаторых паверхах самога старажытнага мура. І паўсюль арганізатары абяцаюць бясплатны ўваход (варта не забыць прагуляцца і ў парку ля замка). Асобным мерапрыемствам запланаваны круглы стол, прысвечаны гістарычнай літаратуры, — і гэта не дзіўна. Карэспандэнт «Звязды» з першых вуснаў — ад будучых удзельнікаў кніжнага свята — пачула, з чым яны прыедуць у замак.

Пісьменніца, журналіст Людміла РУБЛЕЎСКАЯ:



— Я прэзентую свае кнігі, якія выйшлі цягам апошняга года. Адбудзецца знакавая сустрэча: я зноў прыеду ў Мірскі замак, дзе літаральна месяц таму прысутнічала на здымачнай пляцоўцы экранізацыі майго рамана «Авантуры Пранціша Вырвіча». Атрымаецца такое падарожжа ў часе. Тым больш што прэзентаваць я буду адразу дзве кнігі з гэтай серыі. Апошнюю, шостую частку, а таксама першую — бо людзі пастаянна пыталіся, шукалі яе, — таму кніга перавыдадзеная яшчэ раз (менавіта па ёй адбываецца экранізацыя). Я прысутнічала на начных здымках праекта. І трэба сказаць, што Мірскі замак выступіў у ролі Слуцкага замка. Адбывалася рэканструкцыя тэатра Гераніма Радзівіла — жорсткага магната. Гэта было абсалютна чароўнае відовішча! Толькі ўявіце: дзеці з мінскага харэаграфічнага вучылішча ў касцюмах эпохі барока, напудраных парыках на фоне габеленаў, цудоўнай мэблі, на старажытным паркеце... Гістарычныя экспанаты нібы ажылі. У Мірскім замку здымалі сцэны з танкам на паравым рухавіку па эскізах Леанарда да Вінчы, які фігуруе ў маім рамане. Я ніколі ў жыцці не думала, што ўбачу яго на свае вочы. Тым не менш гэтая цуд-машына ездзіла, страляла. Па сеціве разышлося шмат здымкаў здзіўленых турыстаў. Я спадзяюся, тое, што кіношнікі «Беларусфільма» зрабілі, стане яшчэ адной турыстычнай прывабнасцю для наведвальнікаў замка.

Пісьменнік, выдавец, краязнавец Віктар ХУРСІК:

— Я прэзентую сваю кнігу «Vale!» — яна пра асобу Магдалены Радзівіл. Ужо дваццаць гадоў я даследую жыццё гэтай жанчыны. І справа тут не выпадковая. Я нарадзіўся побач з яе маёнткам, хоць пэўны час і быў далёкі ад гісторыі. Але пасля вырашыў даведацца больш пра Магдалену — і палюбіў яе справы, яе жаноцкасць, яе незалежнасць і яе палітычныя і грамадскія погляды. Род Завішаў заўсёды падкрэсліваў сваю літвінскасць, сваю беларускасць. У адным з гістарычных даведнікаў вядомым сучасным даследчыкам гэты род пазначаны як старажытны польскі — на жаль, дапушчана такая памылка. На пачатку сваёй работы я адштурхнуўся ад таго, што мы не ведаем уласнай гісторыі. Тыя памкненні, якія цяпер існуюць у стварэнні кніг пра беларускую дзяржаўнасць, пра яе непарушнасць, нейкай нітка-ай я імкнуўся паказаць і ў выданні. Ёсць старажытнасць, ёсць даўні род. Я адлюстроўваў, чые бакі займалі Завішы, як яны памяркоўна імкнуліся вырашыць пытанне сваёй незалежнасці ў стасунках з першымі расійскімі чыноўнікамі, з губернатарам. І як іх прадстаўніца, Магдалена прыйшла да высновы, што менавіта ёй, найбагацейшай землеўласніцы Беларусі, было наканавана стаць фінансісткай беларускага адраджэння ў 1920-я гады. Ці было гэта дзівацтвам, ці было заканамерным? А ўвогуле пытанне фінансавання нацыянальных рухаў на пачатку XX стагоддзя і вызвалення з-пад расійскага прыгнёту ніхто не даследаваў. Я ж дакументальна паказаў, як адбывалася станаўленне таго, пра што і пра каго сёння мы з гонарам кажам — газету «Наша Ніва», выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца», дзеячаў Янку Купалу, Браніслава Эпімаха-Шыпілу. Магдалена Радзівіл фінансавала і падпольныя школкі, і беларускасць касцёла і многае іншае. Шчыра запрашаю на сустрэчу ў Мір, каб яшчэ больш пранікнуцца духам гэтай асаблівай жанчыны.

Дырэктар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Уладзімір АНДРЫЕВІЧ:

— Выдатна, што ёсць такія пісьменнікі, якія вяртаюць нас не проста да гісторыі, але да гісторыі культуры, да мінулага вядомых людзей-беларусаў. У наш час вельмі ахвотна чытаюць творы Уладзіміра Караткевіча. Таму мы рыхтуем энцыклапедычны даведнік, прысвечаны гэтаму аўтару, — у ім распавядаецца пра асабістыя пачуцці вядомага пісьменніка, пра яго сяброў, пра тое, як ствараліся выдатныя творы. Гэта першая прыступка да энцыклапедыі пра Караткевіча. Мы выдалі кнігу і пра народныя музеі ў школах — такіх у нас крыху больш за 180. Я мяркую, што мы запросім на кніжныя сустрэчы гісторыкаў, выкладчыкаў гісторыі і музейных работнікаў Карэліцкага раёна і ўвогуле Гродзеншчыны. Упэўнены, атрымаецца цікавая сустрэча. У серыі «Беларуская дзіцячая энцыклапедыя» свет пабачылі два выданні — «Як жылі продкі ў X—XIII стагоддзях?» і «Ваяры Беларусі X—XI стагоддзяў». Гэта цікавыя гістарычныя, выдатна аздобленыя дзіцячыя кнігі. Яны ў школьнікаў і моладзі атрымаюць станоўчы водгук і яшчэ раз будуць прадстаўлены ў Міры.

Дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК:



— Чаму для круглага стала тэмай абрана менавіта гістарычная літаратура? Бо мы ўсе шмат гадзін праводзім за манітарамі сваіх камп'ютараў, але ў той жа час цікавасць да гісторыі ўвесь час павялічваецца. Думаю, гэта не проста цікавасць да мінулага, а цікавасць да саміх сябе — хто мы ёсць? Азіраючыся назад, вывучаючы старажытнасць праз мастацкія творы, мы ў той жа час глядзім у будучыню, і яна робіцца для нас больш акрэсленай. У круглым стале ўдзел прымуць нашы знакамітыя пісьменнікі — Людміла Рублеўская, Навум Гальпяровіч, Валерый Казакоў, Анатоль Бутэвіч. Кожны з іх так ці іначай працуе ў гістарычным жанры і мае сваю асобную літаратурную дзялянку, якая не перасякаецца з працай іншага аўтара... Тое, што ў Мірскі замак прыедуць пісьменнікі, мне здаецца важным не толькі для чытачоў, але і для саміх пісьменнікаў, якія змогуць знайсці там натхненне. Бо і Уладзімір Караткевіч ствараў, натхніўшыся беларускімі замкамі. Упэўнены, нашы пісьменнікі вернуцца з Міра з новымі ідэямі твораў.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Слова краязнаўцу

ПЕСНЯ Ў СПАДЧЫНУ

Трынаццатая навукова-краязнаўчая канферэнцыя ў Маладзечанскай цэнтральнай бібліятэцы гэтым разам была прысвечана навуковай дзейнасці доктара філалагічных навук, заўзятага фальклярыста, пісьменніка Арсеня Ліса, якому сёлета магло б споўніцца 85 гадоў. Калісьці цікавасць да народнай песні і да грамадскага нацыянальнага руху 20-х гадоў мінулага стагоддзя вызначыла тэмы экспедыцый і лёс даследчыка Арсеня Ліса ў навуцы. Сёння яго спадчына становіцца прадметам даследавання новых навукоўцаў.

Ва ўступным слове арганізатар канферэнцыі краязнавец, выдавец, пісьменнік Міхась Казлоўскі адзначыў, што найбольшая заслуга Арсеня Сяргеевіча ў тым, што ён быў не толькі дбайны збіральнік фальклору, але і першы даследчык, які вывучаў навуковую і літаратурную спадчыну тэарэтыка мастацтва Мікалая Шчакаціхіна, мастака Язэпа Драздовіча ды многіх слынных беларусістаў.

Краязнавец Валеры Бурэнь акцэнтаваў увагу на пунктах судакранання дзвюх слынных асоб: Арсеня Ліса і адкрытага ім для нашчадкаў Язэпа Драздовіча. Яны абодва былі ўлюбёныя ў Вільню, што стала для беларусаў-адраджэнцаў культурнай і духоўнай сталіцай. Абодва насуперак абставінам і неспрыяльнай палітычнай сітуацыі, падымалі пласты

занядбанай гісторыі краю, ствараліі і ўзбагачалі беларускую культуру. Іх, па словах выступоўцы, аб'ядноўваў адзін грамадзянскі доўг — паказаць канкрэтную, а не абстрактную надуманую Беларусь.

Прадстаўляючы навукоўца з Гродна Андрэя Вашкевіча, Міхась Казлоўскі засяродзіў увагу прысутных на тым, што ў беларускіх музеях і архівах сёння ёсць шмат матэрыялаў па гісторыі культуры, але часта яны незапатрабаваныя пачатковцамі, — у гэтым кантэксце Андрэй Вашкевіч шчаслівае выключэнне, бо ён мае зацікаўленасць папярэднікамі, што пацвердзіла і выступленне маладога даследчыка. Яшчэ адзін малады навуковец Яніна Грыневіч з Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі адзначыла, што па колькасці зробленых запісаў Арсень Ліс у пяцёрцы найбольш плённых збіральнікаў беларускага фальклору. Вядучы рэдактар студыі «Летапіс» Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», пісьменнік Уладзімір Мароз апавядаў пра Арсеня Ліса як пра таленавітага сцэнарыста. Шкада, што многія фільмы, знятыя па яго сцэнарыях, пакуль не алічбаваныя. А яны не страцілі сваёй актуальнасці да сёння.

Загадчык сектара Інстытута гісторыі НАН Беларусі Андрэй Унучак прысвяціў сваё даследаванне пытанням беларускай ідэнтычнасці і беларускаму нацыянальнаму руху першай паловы XX стагоддзя. Паэтэса, вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Людміла Сільнова расказала пра электронны каталог, што ўтрымлівае творы з друкаванай спадчыны Арсеня Ліса, у тым ліку і вельмі кранальныя лірычныя вершы. На думку выступоўцы Арсень Сяргеевіч стварыў сваю планету Беларусь, якая асацыюецца з планетамі з казкі А. Сент-Экзюперы «Маленькі прынц».

Ала КЛЕМЯНОК, фота аўтара.

Свята

«МЕЧ БРАЧЫСЛАВА» НАПОМНІЎ ПРА МІНУЛАЕ

У Браславе прайшло свята сярэднявечнай культуры «Меч Брачыслава». У праграме, якая разгарнулася ўвечары 1 чэрвеня на Замкавай гары, былі паказальныя выступленні клубаў гістарычнай рэканструкцыі з розных краін, там паказалі распальванне жывога агню, прадстаўленне вулічнага тэатра «Вір», прадстаўленне «Браслаўскі фальварак» з мясцовымі вынаходствамі і многае іншае. Арганізатары свята — Міністэрства культуры, Віцебскі аблвыканкам, Браслаўскі райвыканкам.

Фота БелТА.

Пантэон Айчыны

Казімір Семяновіч

(? — пасля 1650)

Яго геній апярэдзіў час і толькі ў XX стагоддзі знайшоў сваё ўвасабленне ў практыцы. Чалавецтва пераадолела зямное прыцяжэнне і вырвалася ў космас. Мала хто ведаў тады, што ідэя шматступеньчатай ракеты належыць беларусу Казіміру Семяновічу.

Скупыя звесткі захаваліся пра ягоны жыццёвы шлях. Хоць і лічыў Казімір Семяновіч сябе «шляхціцам-ліцвінам», але, верагодна, паходзіў з роду дробных беларускіх князёў Семяновічаў. З дакументаў вынікае, што ў XIV стагоддзі ім належалі «двор Быхово» і ўладанні ў Дубровенскай зямлі.

У 1634 годзе Казімір Семяновіч удзельнічаў у аблозе рускага горада Белы, а праз дзесяць гадоў, 30 студзеня 1644 года, — у бітве з крымскімі татарамі. Тады яго ўразіла дымавая заслона, якой татары выратавалі сваю адступаючую конніцу. Казімір Семяновіч, пэўна, быў яшчэ не вельмі дасведчаны ў артылерыйскім мастацтве, а таму палічыў, што феерверкеры дзейнічалі «з дапамогай д'ябла туманам ды параю зацямнілі сонца на пабаявішчы». Можа, менавіта тады і ўзнікла ў яго жаданне авалодаць усімі ведамі артылерыйскага мастацтва. У сваёй кнізе ён успамінаў: «...неўзабаве я прысвяціў сябе дэталёваму вывучэнню такога мастацтва, да якога меў такую вялікую прагу, так што я ніколі нідзе не шкадаваў тых выдаткаў (хоць гэта і дужа змяншала мае асабістыя сродкі), калі знаходзіў штосьці, чаго яшчэ ці не ўмеў, ці не паспрабаваў на практыцы. Дзякуючы разумным парадам сяброў і ўласным роздумам я зразумеў, што ніколі не здолею дасягнуць пастаўленай мэты, калі буду вывучаць гэтае мастацтва без сістэмы... Для гэтага я вывучаў вельмі шмат навук, як вызваленых, так і механічных. У навукі вызваленыя я залічаю арыфметыку, геаметрыю з яе часткамі, механіку, а г. зн. статыку, гідраўліку, пнеўматыку, грамадзянскую і ваенную архітэктуры (г. зн. фартыфікацыю), графіку, оптыку і тактыку. Засвоіў я таксама пэўныя звесткі з фізікі, хіміі». Можна ўявіць гэтую тытанічную працу — на такое быў здольны толькі валявы і таленавіты чалавек, на здзяйсненне задуманага быў неабходны моцны імпульс. І ён у Семяновіча быў — гэта «жаданне паслужыць Айчыне і сваім суродзічам...»

Дома дастатковых ведаў Казімір Семяновіч не атрымаў, а таму ў 1645 годзе ён адправіўся ў Нідэрланды. А каб навучыцца артылерыйскаму мастацтву на практыцы, ён уступіў у войска герцага Фрэдэрыка Генрыха Аранскага. Гэта была патрэбная школа, і Семяновіч навучыўся шмат чаму: «...у час вельмі многіх славутых аблогаў у Нідэрландах, адбываючы практыку вайсковую і выконваючы абавязкі, звязаныя з ёю, а таксама выхоўваючы годнасць артылерыйскую, запісаў шмат рэчаў, частку сам вынайшаў, нечаму навучыўся ў іншых», — прызнаваўся ён. І калі Семяновіч у 1646 годзе па выкліку караля Уладзіслава IV вярнуўся ў Рэч Паспалітую, то быў ужо дасведчаны і даволі аўтарытэтны ў артылерыйскай справе чалавек. Кароль назначыў яго інжынерам у польскай артылерыі. Можна не сумнявацца, што і на гэтай пасадзе Семяновіч працягваў назапашваць і ўдасканальваць свае веды. Яго аўтарытэт рос і ў 1648 годзе інжынер становіцца намеснікам начальніка артылерыі.

У канцы 1648 года Казімір Семяновіч зноў прыехаў у Нідэрланды. Гэтым разам не як вучань, а як настаўнік. У яго ўжо было дастаткова ведаў наконт артылерыі, каб падзяліцца імі з іншымі. Яшчэ два гады прайшлі ў напісанні і падрыхтоўцы кнігі да друку. І вось у 1650 годзе ў Амстэрдаме ў друкарні Яна Янсана свет пабачыла «Вялікае мастацтва артылерыі».

Мэту сваёй кнігі Семяновіч бачыў так: «...выданнем гэтае працы я хацеў бы зрабіць паслугу маёй Радзіме і маім суайчыннікам, якія заўсёды выяўлялі вялікую схільнасць да згаданай навукі і якія цанілі яе болей, чым іншыя галіны вайсковай навукі, аднак жа да гэтага часу не мелі кніг, па якіх маглі б вывучаць яе». Як успрынялі суайчыннікі працу Семяновіча, невядома, а вось іншаземцы яе ацанілі. Паўтара стагоддзя гэтая кніга была еўрапейскім падручнікам па артылерыі.

У кнізе Казімір Семяновіч паказаў усю паўнату ведаў аб артылерыі, якія набыў за гады тэарэтычнага і практычнага вывучэння артылерыйскага мастацтва, амаль 260 твораў, пачынаючы з антычных, выкарыстаў у сваёй працы аўтар. У пяці раздзелах распавядаецца пра ўсё, што датычыцца артылерыі, — метады вырабу пораху і запальных рэчаў, выкарыстанне выбуховых прыстасаванняў і г. д. У раздзеле «Аб ракетах» Семяновіч піша аб канструкцыях і спосабах вырабу разнастайных ракет. Многія тыпы ракет прапанаваў Семяновіч упершыню, і ў прыватнасці састаўныя і шматступеньчатыя. Ён не робіць сакрэтаў са сваіх доследаў — друкуе табліцу адносін дыяметра ракеты да яе даўжыні. Каб скласці яе, Казіміру Семяновічу давялося правесці шмат эксперыментаў, на якія былі патрачаны «вялікія грашовыя выдаткі». Адкрыццём Семяновіча было і тое, што ён вынайшаў спосаб стабілізацыі палёту ракеты.

«Вялікае мастацтва артылерыі» адразу пасля выхаду было заўважана. У 1661 годзе яно перакладаецца на французскую мову, у 1676 годзе з'явіўся нямецкі пераклад, у 1729 — англійскі. Праца перакладалася на галандскую і дацкую мовы. Натхнёны поспехам, Казімір Семяновіч напісаў працяг сваёй кнігі, дзе разглядаў новыя пытанні і праблемы артылерыйскага мастацтва. «Гэта мая новая вынаходка, у якой змяшчаюцца ўсе нашы веды, яна адна перасягае шмат якія іншыя прыстасаванні і замяняе іх усе». Што ж маецца на ўвазе? Гісторык Міхась Ткачоў меркаваў, што гэта — універсальныя аптычна-механічныя прылады накшталт нівеліра, бусолі ці кіпрэгеля.

Збіраўся Семяновіч разгледзець некаторыя геаметрычныя, астранамічныя і геаграфічныя пытанні. «Як толькі ўсё гэта ў адпаведных месцах дойдзе да свядомасці кожнага, тады адбудзецца вера ў мае словы». Рукапіс новай працы Казіміра Семяновіча не быў надрукаваны. Магчыма, у ім падаваліся сакрэтныя на той час звесткі пра артылерыю? Ды яшчэ ўнікальнае вынаходніцтва! А ваенныя таямніцы заўсёды хаваліся ад людзей. Дарэчы, як мяркуе «піянер касманаўтыкі» амерыканскі вучоны Ары Штэрнфельд, Казімір Семяновіч быў забіты рамеснікамі-піратэхнікамі за тое, што ў сваёй кнізе выдаў сакрэты і таямніцы артылерыйскага мастацтва.

Як завяршыўся жыццёвы шлях Казіміра Семяновіча, невядома, але зробленае ім прадвызначыла развіццё артылерыйскага мастацтва як навукі на стагоддзі і ўказала чалавецтву шлях у космас.

Вітаўт ЧАРОПКА.

Сваімі словамі

ГАННЫ-ДЖУЛІІ І АЛЕСІ

За кім будучыня нацыянальнай кухні?

Ёсць такая рэальная гісторыя, якая стала асновай для галівудскага фільма «Джулі і Джулія». Жанчына па імені Джулі Паўэл, працуючы аператарам кол-цэнтра (а ў фільме — сакратаркай), вырашае штодня гатаваць па адной страве з кнігі іншай Джуліі, па прозвішчы Чайлд, якая жыла стагоддзем раней. Кніга называецца «Як авалодаць мастацтвам французскай кухні?» Тое ж адбываецца і ў фільме: на звычайнай невялічкай кухні ў хмарачосе гараджанка ажыўляе рэцэпты з мінулай эпохі.

Справа гэта зусім не простая — ні з першага погляду, ні пры дэталёвай яе распрацоўцы. Амерыканка, прывучаная да фастфуду (хуткай ежы), вучыцца гатаваць складаныя соўсы, сама разбірае тушку індычкі, выпякае складаныя дэсерты. І ўсё гэта ў вольны ад асноўнай працы час, вечарамі, калі звычайнае жыццё ўжо заціхае... Тэмп гераіня задала сабе вельмі высокі: 365 страў за 365 дзён — ні дня без складанага гатавання!

Думаю, на голым энтузіязме вытрымаць гэтую кулінарную дыстанцыю было б вельмі няпроста. Джулі дапамагае тое, што яна вядзе ў Сеціве блог, у якім штодня апісвае працэс гатавання. Блог даволі хутка займеў вялікую папулярнасць. І вось жанчына ў пэўным сэнсе ўжо гатуе не адна — за яе поспехамі (а магчыма, і няўдачамі) пастаянна сочыць шмат людзей.

У выніку ўсё ў кухаркі-амерыканкі атрымліваецца: справу яна даводзіць да канца і французскай кухняй авалодвае — разам са сваімі чытачамі. Яе блог выдалі як асобную кнігу, якая таксама займела папулярнасць. А ў выніку і фільм вырашылі зняць — рэальная Джулі ўдзельнічала ў напісанні сцэнарыя.

У маёй галаве адразу ўзнікла паралель з нашай сучаснасцю і з кнігамі па старажытнай беларускай кухні — «Літоўская гаспадыня» Ганны Цюндзявіцкай і «Наша страва. Сапраўдная беларуская кухня» ўкладальніка Алеся Белага. Думаю, было б цікава, каб якая-небудзь Ганна (ці Алесь) ва ўмовах сучаснасці правялі той жа эксперымент — на ўласнай кухні, для сваіх сямейнікаў кожны дзень гатавалі б па адной страве з кнігі — і так столькі дзён, колькі страў у кнізе!

Хтосьці прыгадае, што на тэлеканале «Беларусь 3» ёсць нечым падобная перадача: спачатку ў вясковай хаце гатуецца арыгінальная страва, а паралельна яе ж у тэлестудыі гатуюць тэлевядучая і шэф-повар. Але, па-першае, арыгінальная страва ў студыі даволі часта асучасніваецца — ёй дадаюцца новыя, і на думку прафесійнага кухара, важныя рысы — таму пра аўтэнтычнасць ежы мы ўжо не гаворым. А па-другое, я неяк спрабавала занатаваць рэцэпт з тэлеэкрана — таксама нічога не атрымалася: ці то прапорцыі не былі прапісаны, ці то быў прадстаўлены толькі сучасны варыянт...

bestbelarus.by

Безумоўна, перадача мае права на жыццё — і яе цікава паглядзець. Але такіх вось «энтузіястаў з народа», Ганнаў і Алесяў, якія маглі б сур'ёзна ўзяцца за папулярызацыю традыцыйнай беларускай ежы, нам вельмі не хапае. І калі ў плане даследавання айчыннай кухні ладны кавалак гэтай працы зроблены тым жа Алесем Белым, то ў справе самога прыгатавання і пераемнасці існуе вялізны прабел. Некалькі сталічных рэстаранаў гатовыя прапанаваць аўтэнтычныя стравы (вядома ж, па завоблачных коштах), а вось дзесьці ў рэгіёнах (калі толькі не трапіце ў госці непасрэдна да хлебасольнай гаспадыні) вы не пакаштуеце таго смакоцця, якое ад прадзедаў спакон вякоў.

Патрэбны такія Джуліі-Ганны і Алесі, якія ажывяць запыленыя рэцэпты. Або занатуюць, навучацца гатаваць тое, што яшчэ ад прабабуль, але па-ранейшаму гатуюць мамы. І не толькі зробяць гэта здабыткам уласных сем'яў, але і ў пэўнай простай, нязмушанай форме падзеляцца з іншымі.

І тады наша кухня закрасуе. Яе перасохлае рэчышча запоўніцца малочнымі рэкамі сярод кісельных берагоў — і не толькі. Цяпер модным робіцца здаровае харчаванне — людзі свядома адмаўляюцца ад салодкага, мучнога, смажанага, вялікую ўвагу надаюць садавіне і агародніне. Хто ведае, можа, заўтра такую ўсенародную любоў займее беларуская кухня?.. Плынь часу і густаў непрадказальная. А накіроўваюць гэтую плынь звычайна канкрэтныя людзі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «СМТ № 8», г. Минск, ул. Пионерская, 37

Предмет аукциона

Лот № 1
Месторасположение: Минская обл., г. Жодино, ул. Дорожная, д. 2

Производственная база в составе: **здание ремонта транспорта** (78 кв. м, 612/С-7856), **здание склада** (404 кв. м, 612/С-4244), з**дание склада** (234,5 кв. м, 612/С-5843), **здание мастерских** (458 кв. м, 612/С-4246), **здание ангара** (661 кв. м, 612/С-4240), **здание столярного цеха** (113,7 кв. м, 612/С-4248), **здание административно-бытового корпуса** (318,8 кв. м, 612/С-4999, составные части: две пристройки, навес, ограждения, покрытия, площадка ТБО), **здание склад масел** (55 кв. м, 612/С-4241), **здание автозаправочной станции** (6,7 кв. м, 612/С-4242), **электролиния ВЛ-0.4** (509,7 м, 612/С-6757, составные части: кабельная электролиния, опоры, подстанция (КТП-160кВа-10/0.4)), иное имущество (можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by).

Сведения о земельном участке: **пл. 1,9586** га, предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений производ. базы. Ограничения (обременения) прав: охранная зона канализац. коллекторов, пл. 0,2678 га

Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 601 308,07 бел. руб.
(снижена на 40 %)

Лот № 2
Месторасположение: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, пр-т Революции, 9

Административно-хозяйственная база в составе: **административное здание** (1028,6 кв. м, 610/С-2201, составные части: пристройка, водопровод, канализация, теплотрасса, ограждение, площадка, тротуар), **здание служебных гаражей** (214 кв. м, 610/С-2506), **многолетние насаждения** (инв. № 8945) в количестве 16 штук.

Сведения о земельном участке: **пл. 0,3856** га, предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания административно-управленческого корпуса и служебных гаражей

Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 788 988,61 бел. руб.
(снижена на 25 %)

Обременения: площади зданий лотов № 1 и № 2 частично сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

Задаток 1 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.04.2019

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона: 18.06.2019 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 17.06.2019 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Антикризисный управляющий индивидуальный предприниматель Шило Алексей Сергеевич объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества частного предприятия «ВВА и К» (дата торгов: 05.07.2019 в 09.30), дебиторской задолженности и имущества ООО «Сфера-СК» (дата торгов: 24.06.2019 в 10.00).

Место проведения торгов: г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 517, тел. 8 029 3360872.

Подробная информация о дате, времени и порядке проведения торгов, предлагаемых к продаже лотах, начальной цене и размере задатков, продавце и организаторе, иная информация, требуемая в соответствии с законодательством, размещена в Едином государственном реестре сведений о банкротстве: http://bankrot.gov.by.

УНП 191720323

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «МЭТЗ ИМ. В. И. КОЗЛОВА», г. Минск, ул. Уральская, д. 4, каб. 502

Предмет аукциона (одним лотом)
Месторасположение: Минская обл., Пуховичский р-н, Свислочский с/с, 7

Производственная база в составе: **здание закрытой стоянки спецавтоматизации и механизмов с АБК** (2706,9 кв. м, 602/С-17926, составные части: навес, пристройка топочной, тамбур, площадка, внутриплощад. дорожки, ворота, забор), **здание закрытой стоянки спецавтоматизации и механизмов** (1591,2 кв. м, 602/С-17925), **здание склада трансформаторной стали** (5251,3 кв. м, 602/С-17924), **навес для хранения древесины** (135 кв. м, 602/С-54176), **навес** (129,7 кв. м, 602/С-54177) и **склад** (51,1 кв. м, 602/С-54178) **для хранения материалов на п/б «Дружный», хозпитьевой и пожарный водопровод** (441.5 м, 602/С-55811), **наружная канализац. сеть** (678.07 м, 602/С-55813), **наружные теплосети** (451.7 м, 602/С-56336), внутриплощадочные сети электроснабжения (инв. № 1А), иное имущество (можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

Сведения о земельных участках, предоставленных продавцу на праве постоянного пользования:
1) пл. **5,1494 га** для обслуживания производ. зданий и сооружений (ограничения (обременения) прав: охранные зоны линий связи и радиофикации, сетей и сооружений водоснабжения, канализации и теплоснабжения);
2) для обслуживания сетей теплоснабжения на промплощадке ТЭЦ-5 – пл. **0,0041 га, 0,0018 га, 0,0055 га** (ограничения (обременения) прав: охранные зоны сетей и сооружений теплоснабжения, территории перспективного развития населенных пунктов)

Обременения: площади здания закрытой стоянки спецавтоматизации и механизмов с АБК (по ЕГРНИ 602/С-17926) частично сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

Начальная цена с НДС – 1 799 430,72 бел. руб. (снижена на 40 %)

Задаток 1 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 14.05.2019

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Аукцион состоится 20.06.2019 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 18.06.2019** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by. **E-mail: auction@cpo.by**

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) **по поручению Республиканского дочернего унитарного предприятия «Белоруснефть-Транс» (продавец)** информирует о снятии с аукционных торгов **лота № 1:** Грузовой специальный автомобиль MAZ 5902 02 (рег. знак № АК 7769-3), инвентарный номер № 1859036 (по бух. учету), год выпуска – 2012, **назначенных на 25.06.2019 г.,** опубликованные в газете «Звязда» от 25.05.2019 г. **Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

УНП 491317683

Уважаемые акционеры ОАО «Белкотлоочистка»!

Внеочередное собрание акционеров состоится 14 июня 2019 года, начало собрания 10.00, место проведения – г. Минск, ул. Аранская, 22а. Регистрация проводится с 9.00 до 9.45 (при себе иметь паспорт)

Повестка дня :

1. Расторжение договора с ООО «ПРАЙМ ЕВРО ИНВЕСТ» № 01/10-16 от 11.10.2016 г.
2. Избрание директора ОАО «Белкотлоочистка».

Тел. для справок (017) 298-27-57

УНП 100071353

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении публичных торгов в форме аукциона по продаже имущества ОАО «83 Управление начальника работ»

1. Дата и время проведения: 18.06.2019 в 11.00

2. Прием заявлений участников на участие в торгах будет осуществляться с 09.00 06.05.2019 до 10.00 18.06.2019.

№ лота	Наименование	Начальная цена, руб.	Шаг аукциона, руб.	Размер задатка, руб.
1	Автомобиль ЗИЛ431410, 1990 г.	1035,00	105,00	51,75
2	Автомобиль самосвал ЗИЛ ММЗ 4505, 1990 г. в.	1035,00	105,00	51,75
3	Автомобиль самосвал ЗИЛ ММЗ 4505, 1990 г. в.	1035,00	105,00	51,75
4	Автомобиль ЗИЛ431410, 1990 г.	1035,00	105,00	51,75

3. Продавец и организатор торгов: ОАО «83 Управление начальника работ», тел. +375291070012.

4. Место проведения: г. Барановичи, ул. 50 лет ВЛКСМ, 3.

5. Место нахождения предмета торгов: г. Барановичи, ул. Чурилина, 17.

6. Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет предприятия, с отметкой банка Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение десяти рабочих дней со дня их проведения. Кроме того, представляются следующие документы:

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копии устава (учредительного договора) и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона,

доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – резидентом Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;

представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов.

7. Ознакомиться с предметами торгов можно по месту нахождения, предварительно согласовав дату и время с представителем продавца по тел. +375291070012.

8. По результатам торгов организатором торгов составляется протокол, подписываемый всеми участниками аукциона.

9. С победителем торгов продавцом в срок не позднее 15 рабочих дней от даты подписания протокола о результатах торгов заключается договор купли-продажи. Приобретенный предмет торгов оплачивается участником, выигравшим торги, не позднее 3 рабочих дней от даты заключения договора купли-продажи.

10. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов может быть подан этому участнику по цене, превышающей начальную, на 5 %.

Вниманию акционеров ОАО «Белсолод»

12 июня 2019 г. по адресу г. Иваново, ул. Полевая, 32 состоится внеочередное общее собрание акционеров. Начало работы собрания в 14.00. Время регистрации участников собрания – в день проведения собрания с 13.00 до 13.55. Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – также доверенность или договор). С информацией (документами) при подготовке к проведению собрания можно ознакомиться с 31 мая по 11 июня 2019 года в рабочие дни с 9.00 до 16.00.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О делегировании полномочий коллегиальному исполнительному органу.
2. Об утверждении «Регламента работы ОАО «Белсолод» с реестром владельцев ценных бумаг».
3. О вступлении ОАО «Белсолод» в члены Брестского областного агропромышленного Союза.
4. Об утверждении Положения «О ревизионной комиссии ОАО «Белсолод».

Наблюдательный совет.

УНП 200075434

5 июля 2019 г. ИЗВЕЩЕНИЕ №7-А/2019
о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Кадастровый номер участка	Площадь, га	Целевое назначение	Наличие ограничений	Срок аренды, лет	Начальная стоимость, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на подготовку документации, руб.
1	В микрорайоне Энергетиков, 16	340100000005007402	0,0020	Для размещения легкотипного торгового павильона	Органичений в использовании не имеет	5	89,35	10,00	2 534,24
2	По ул. Лепешинского (в районе ОАО «Коралл»)	340100000002006061	0,1762	Для строительства и обслуживания автомойки	Охранная зона сетей и сооружений канализации, объектов газораспределительной системы	5	8 052,25	500,00	3 410,44
3	По ул. Олимпийской (в районе существующей АЗС)	340100000002006063	0,1948	Для строительства и обслуживания ветеринарной клиники	Охранная зона электрических сетей, объектов газораспределительной системы; произвести вырубки древесно-кустарниковой растительности; произвести подсыпку территории	5	29 976,06	1 000,00	3 898,13
4	В микрорайоне № 18 (позиция № 40в и № 40г)	340100000001006402	0,1406	Для строительства магазина продовольственной группы товаров и бара на 30 мест	Охранная зона линий связи и радиофикации, электрических сетей, сетей и сооружений канализации	5	23 397,08	1 000,00	3 054,16
5	В микрорайоне № 19 (позиция № 65 по генплану)	340100000001006221	0,4309	Для строительства и обслуживания банно-оздоровительного комплекса	Охранная зона линий электропередачи, водоохранная зона рек и водоемов	5	76 938,08	3 850,00	3 394,26
6	В микрорайоне 59Б	340100000006005680	2,6500	Для строительства многофункционального комплекса (магазин продовольственных товаров, магазин промышленных товаров, баня, парикмахерская, мастерские бытового обслуживания населения)	Охранные зоны сетей и сооружений теплоснабжения, электрических сетей, объектов газораспределительной системы, зона санитарной охраны водопроводных сооружений	5	229 056,20	11 500,00	5 844,03

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).

2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3–6, № 3–14).

3. **Аукцион состоится 5 июля 2019 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах) – это только для физических лиц. Индивидуальные предприниматели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.

Необходимые документы:

4.1 граждане – копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.3 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

4.6 представители иностранногогражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность, и его копию.

5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 4 июня по 2 июля 2019 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед: 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3–6, 3–14**

Контактный телефон: +375 232 30 12 46. Информация размещена на сайте: www.gomeloblzem.by либо geodezcentr.by

ЯЗЭП ДЫЛА: АПОШНІ З ПЕРШЫХ

Ён прыдумаў, як падзяліць Беларусь на раёны, кіраваў сённяшнім Купалаўскім тэатрам і пісаў для яго п'есы, быў адзіным членам першага ўрада Савецкай Беларусі, які выжыў у рэпрэсіях

Першы наркам працы Савецкай Беларусі Язэп Дыла сярод герояў нашай рубрыкі — сапраўдны доўгажыхар. Мала каму з яго калег і аднадумцаў удалося дажыць да пяцідзесяці — калі не першая, дык другая хваля рэпрэсій змяла ўсіх, а ён памёр сваёй смерцю ў больш чым паважаным узросце — за тыдзень да свайго 93-га дня нараджэння... Шчаслівы, скажа хтосьці. Не факт, адкажуць тыя, хто ведае яго біяграфію. Бо чалавек, які з юнацтва рупіўся пра Беларусь і беларушчыну, які шчыра працаваў дзеля гэтай ідэі, амаль палову свайго доўгага жыцця правёў удалечыні ад Бацькаўшчыны. Спачатку вярнуцца дадому не давалі, пасля... Не захацеў сам? Як было на самай справе, мы сёння можам толькі здагадвацца, бо яго шматлікія рукапісы, напісаныя блытаным почыркам, дагэтуль ляжаць у архівах неразабраныя, дый пасля 1930-га пра яго жыццё (прычым ад яго самога) мы ведаем толькі сціслымі ўрыўкамі. А між тым у гісторыі нашай краіны ён пакінуў значны след. У першыя гады маладой рэспублікі гэта быў сапраўдны «ўніверсальны салдат», які займаўся адміністрацыйным дзяленнем, кіраваў нацыянальнай кааперацыяй, працаваў у тэрміналагічнай камісіі, рупіўся аб беларускім тэатры і кінематографе... А пасля — забыццё на доўгія гады. Зрэшты, чаму забыццё? Ёсць жа мы — тыя, хто хоча памятаць і ведаць.

Сацыяліст з нацыянальным ухілам

Язэп Дыла з усіх герояў нашай рубрыкі мае, бадай што, самы лагічны і зразумелы пачатак біяграфіі. Яшчэ з часу, калі хадзіў у Слуцкую гімназію, усё складвалася так, што побач з сацыялістычнымі ідэямі, якія ў той час луналі ў паветры, у яго жыцці дамінаваў менавіта нацыянальны складнік. Яму шанцавала з дарослымі людзьмі, якія траплялі на яго шляху ад пачатку, для якіх сваё, беларускае, было неад'емнай умовай існавання.

Язэп (Восіп) Лявонавіч Дыла нарадзіўся ў красавіку 1880 года ў Слуцку ў сям'і паштовага служачага. Але да дзевяці гадоў, як ён сам згадвае ва ўспамінах, выхоўваўся ў бабулі і дзеда па маці, Дамінікі і Тодара Куляшэвічаў (Тодар Кулеша будзе пасля адным з яго псеўданімаў). Бабку Дамініку ён памятаў да канца свайго жыцця — яна згадваецца ў першых радках аўтабіяграфіі, якую з яго слоў Адам Мальдзіс запісваў, калі самому аўтару ішоў ужо 89-ы год (пра гэта раскажам ніжэй). Бабуля была сапраўднай носьбіткай народнай творчасці, ведала шмат песень і казак. А стрыечны брат бацькі нашага героя, Нічыпар Дыла, быў, як ён сам яго называе, апошнім слуцкім батлеечнікам, які са сваімі лялькамі хадзіў па хатах і паказваў прадстаўленні. Са стрыечным дзядзькам Язэп у дзяцінстве таксама добра камунікаваў, бо ва ўспамінах нават згадвае, што Нічыпар, здаралася, браў лішку, і тады лялек за яго вадзіла дачка Наталка...

Быў у жыцці хлопца яшчэ адзін важны чалавек. Аднойчы бацька запрасіў у іх дом Альгерда Абуховіча — таго самага ўдзельніка паўстання 1863 года, шляхціца, які адмовіўся ад маёмасці, пісьменніка, які тварыў на «мужыцкай» мове пад псеўданімам Граф Бандынэлі. Язэп разам з братам часта бываў у доме былога паўстанца. Падлеткі чулі там разважанні аб лепшай долі для народа, знаёміліся з новымі літаратурнымі творамі і класікай, вучыліся разумець, што ў роднай мове, на якой гавораць блізкія людзі, няма нічога заганнага. «Кожны раз пасля слухання яго баек, сатыры і вершаў мацнела ў мяне любоў да роднай мовы, і я ўжо не са слязьмі ў душы, а з гнеўнай упэўненасцю абараняў сваю родную мову, называючы тых, хто ставіўся да яе з пагардаю, здраднікамі свайго народа», — напіша пасля Язэп Дыла ва ўспамінах, прысвечаных свайму настаўніку.

Гэта было ў канцы XIX стагоддзя, і такая пазіцыя маладога чалавека не магла застацца незаўважанай у той жа гімназіі. Каб плаціць за навучанне, Язэп даваў прыватныя ўрокі «слуцкім мітрафанушкам», на гэтым падарваў здароўе. Бацькі адправілі яго на лячэнне, а вярнуўшыся адтуль, юнак даведаўся, што месца ў гімназіі яму як нядобранадзейнаму ўжо няма. Давялося шмат займацца самаадукацыяй, каб паступіць ва ўніверсітэт. У яго гэта атрымалася: у хуткім часе ён ужо значыўся студэнтам Юр'еўскага (сёння гэта эстонскі Тарту) ветэрынарнага інстытута і наведваў прыродазнаўчыя лекцыі ў тамтэйшым універсітэце.

У Юр'еве было шмат землякоў-беларусаў, дый студэнцкае жыццё на мяжы стагоддзяў, натхнёнае ідэямі марксізму, у імперыі віравала. «За ўдзел у студэнцкіх сходах і дэманстрацыях, за прымяненне супраць паліцыі хімічных рэчываў я арыштоўваўся, высылаўся, аддаваўся пад нагляд паліцыі. Урэшце ў 1903 годзе мяне ў трэці раз звольнілі канчаткова без права паступлення ў іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы», — чытаем у аўтабіяграфіі. Фарміраванне рэвалюцыянера было завершана.

Ад выдаўца да камісара працы

У пошуках работы Дыла вяртаецца ў Беларусь і ўладкоўваецца ў газету «Северо-Западный край». Пасля звальнення (у адказ на тэлефонны званок назваў расійскіх генералаў у японскай кампаніі бяздарнымі, а суразмоўнікам аказаўся мінскі губернатар Мусін-Пушкін) падаўся ў Пецярбург, дзе падчас Крывавай нядзелі ледзь не трапіў пад казацкія шашкі — выратаваліся з сябрам, разбіўшы вітрыну і ўваліўшыся ў майстэрню нейкага скульптара. У тым жа 1905-м зноў вяртаецца ў Мінск, зноў уладкоўваецца ў «Северо-Западный край» — больш для адводу вачэй, бо ўжо ёсць іншая мэта — рэвалюцыя. Паліцыя пачынае сачыць за маладым чалавекам, які ўжо значыцца ў Мінскім камітэце РСДРП. Каб пазбегнуць арышту, ён падаецца ў Арэнбург, пасля ў Пецярбург, дзе знаёміцца з жонкай Купрына і дапамагае ёй наладзіць выданне новага літаратурнага часопіса «Современный мир». Пасля загадвае кніжным магазінам у Казані,

займаецца кнігавыдавецкай справай у Маскве. Перад рэвалюцыяй ідзе ў гандаль — загадвае бюро па вывазе мануфактуры. (Не забываючыся, канешне, і пра рэвалюцыйную дзейнасць.) На гэтай пасадзе яго і заспела Кастрычніцкая рэвалюцыя.

Язэп Дыла быў адным з актыўных удзельнікаў І Усебеларускага з'езду ў снежні 1917-га. А як толькі ў Маскве пачаў дзейнічаць Белнацкам, ён тут жа ўключыўся ў яго работу, быў нейкі час старшынёй Цэнтральнага беларускага бежанскага камітэта, плённа супрацоўнічаў з рэдагуемай Цішкам Гартным «Дзянніцай», працаваў у выдавецтве. З кім быць — з «левымі» ці з «правымі», — пытання для яго не існавала: у кастрычніку 1918 года ўступіў у РКП(б) і стаў членам яе Маскоўскай беларускай секцыі. Ад яе быў дэлегатам І канферэнцыі беларускіх секцый РКП(б), на якой у 20-х чыслах снежня 1918-га выказвалася спадзяванне аб хуткім стварэнні Беларускай рэспублікі. І калі рашэнне было прынята, а ў Маскве дзялілі партфелі новага ўрада, Язэпа Дылу, як знаёмага з прафсаюзнай работай, прызначылі камісарам працы.

У Смаленск на з'езд, дзе было прынята рашэнне аб стварэнні ССРБ, яны ехалі разам са Змітром Жылуновічам. Даведаўшыся, што ў Смаленску жыве Янка Купала, завіталі да яго — менавіта ад іх Пясняр даведаўся навіну аб новай рэспубліцы, з ім жа ўзнялі за яе тост...

Універсальны салдат рэвалюцыі

На новай пасадзе чакала шмат работы. У Мінску, адкуль ужо сышлі немцы, але пакуль не прыйшлі палякі, у будынку цырка штодня збіраліся прафсаюзныя мітынгі, на якіх чакалі адказу менавіта ад камісарыята працы (а камісарыят па першым часе быў толькі ўласна сакратар і машыністка). Асабліва складана было дамовіцца з бундаўцамі — яўрэйскім рэвалюцыйным аб'яднаннем... Да таго ж працаваць ва ўрадзе давялося нядоўга — ён быў распушчаны ўжо ў лютым 1919-га, а ва ўрадзе новаўтворанай Літоўска-беларускай рэспублікі Язэпу Дылу з яго «нацыяналістычнымі поглядамі» месца не знайшлося. Але ён камуніст, і «ў парадку партыйнай дысцыпліны» едзе ў Маскву, дзе атрымлівае пасаду ў Цэнтрасаюзе, вакол якога аб'ядноўвалася ўся спажывецкая кааперацыя Савецкай рэспублікі. Там ён праяўляе сябе як удалы маркетолаг — прыдумвае, як здабываць такую патрэбную для маладой знясіленай краіны пушніну, якая лёгка прадавалася за валюту, на якую ў сваю чаргу купляліся за мяжой машыны. Дыла прапаноўвае каштоўныя шкуркі ў паляўнічых поўначы не купляць за абясцэненыя грошы, у якія ніхто не верыў, а мяняць футра на прадукты. Спрацавала — толькі за адзін рэйс па Обі нарыхтавалі 75 тысяч шкурак...

Яго вопыт і арганізатарскі талент не засталіся незаўважаныя ў адноўленай пасля вызвалення ад польскай акупацыі Савецкай Беларусі. У 1921 годзе сакратар Цэнтральнага бюро КПБ(б) Вільгельм Кнорын запрашае яго на работу ў Мінск. Дыла з жонкай і прыёмнай дачкой, дзяўчынкай-сіратой, якую падабралі на вакзале, перабіраецца ў беларускую сталіцу.

Чым ён займаўся ў Мінску? Прасцей адказаць, чым не займаўся гэты ўнікальны чалавек. У сваёй публікацыі, прымеркаванай да 130-годдзя Язэпа Дылы, Адам Мальдзіс піша, што яго найперш здзіўляла і здзіўляе да гэтага часу «шматграннасць дзейнасці Язэпа Дылы, энцыклапедычнасць яго ведаў, атрыманых пераважна шляхам самаадукацыі. Ён упэўнена адчуваў сябе ў самых розных сферах. Скажам, даручылі яму такую справу, як вызначэнне адміністрацыйных цэнтраў маладой рэспублікі. І Дыла, ездзячы па Беларусі, кіруецца найперш эканамічнымі меркаваннямі, глядзіць: куды сяляне звычайна накіроўваюцца на кірмашы. Выбар прызналі ўдалым — ён у многім дзейнічае да сённяшняга дня... Зрабілі яго адказным за электрыфікацыю — і ён едзе ў Маскву, да самога Глеба Кржыжаноўскага, кампетэнтна раіцца з ім, дзе будаваць новую электрастанцыю, і вырашаюць: толькі на Бярэзінскіх запасах торфу... Паставілі яго на чале Першага Беларускага драматычнага тэатра — і ён знаходзіць грошы на пастаноўку п'есы Міхася Чарота «На Купалле». Больш таго: адчуўшы рэпертуарны голад, сам піша «гістарычную хроніку ў 5 дзеях» «Панскі гайдук», наладжвае творчыя кантакты з кіеўскімі акцёрамі... І — ніводнага правалу. Наладзіць работу ў адной установе — яго пасылаюць у іншую...»

Месцы работы — таксама, зразумела розныя — Наркамасветы, Навукова-тэрміналагічная камісія, рэспубліканская кааперацыя, Дзяржаўная планавая камісія і Камісія па раянаванні тэрыторыі рэспублікі (абедзвюма кіраваў), БДТ-1, Інбелкульт (кіраўнік мастацкай секцыі), Белдзяржкіно... «У маладой Беларускай рэспублікі тады не ставала людзей. І таму прыходзілася працаваць на самых розных — часта нечаканых пасадах, а парой і сумяшчаць па некалькі на раз», — тлумачыць ён у сваёй аўтабіяграфіі. І рэзюмуе: «Адным словам, спраў было шмат, спраў новых, цікавых і захапляючых»...

Я пацікавілася, што ж за п'еса «Панскі гайдук», якую Язэп Дыла напісаў для цяперашняга Купалаўскага. Сёння, яе, канешне, на сцэне наўрад ці паставіш, але нават пералік дзеючых асоб паказвае, што ў аўтара быў і літаратурны талент і пачуццё гумару. «Княгіня Раіна Прушынская-Горская, удава па чацвёртаму мужу, ганарыстая, тэмпераментная магнатка... Пані Даміцэля Магільніцкая, як прыбліжоная і ахмістрыня, таксама ўдава, легкадумная весялуха і распусніца... Пан Тадэвуш Чарнецкі, стары кавалер, хітры і жорсткі адміністратар, сыты, з чэравам... Пан Мацей Зубкоўскі, тыповы польскі шляхціц, без адвагі»... Цікавая кампанія, праўда? Язэпа Дылу некаторыя даследчыкі лічаць пачынальнікам сучаснай беларускай гістарычнай прозы — яго раман «На шляху з варагаў у грэкі» пісаўся раней, чым Караткевіч узяўся за «Дзікае паляванне». Як знаўца падзей ад непасрэднага ўдзельніка ён кансультаваў стваральнікаў стужкі «Кастусь Каліноўскі», якую здымалі ў 1928 годзе...

Сорак тры гады без Радзімы

У 1930-м гэты чалавек проста не мог не стаць фігурантам справы аб «Саюзе вызвалення Беларусі». Яго выракаюць на пяцігадовую ссылку ў далёкі Кунгур Пермскай вобласці. Пасля дазваляюць пераехаць у Саратаў. У жніўні 1938 года яго арыштавалі зноў, але ў сакавіку 1939-га справа была спынена (вельмі рэдка, але здаралася і такое).

Ён так і застаўся жыць у Саратаве. Не вярнуўся на Радзіму нават пасля таго, як у 1957-м яго рэабілітавалі. Шмат пісаў — некаторыя рэчы былі апублікаваныя яшчэ пры жыцці, некаторыя ў архівах чакаюць даследчыка, які разбярэ блытаны почырк. У 1968 годзе, калі рыхтавалася святкаванне 50-годдзя БССР, пра Язэпа Дылу, ужо 88-гадовага, успомнілі, накіравалі Адама Мальдзіса ў Саратаў з заданнем напісаць нарыс для часопіса «Полымя». «Я настройваўся пісаць нарыс. Але ў першы ж дзень зразумеў, што гісторыя мне не даруе, калі не запішу аўтарызаваныя ўспаміны Язэпа Дылы. Рабочы дзень у нас быў такі: ён паволі расказваў, а я імкнуўся як мага хутчэй, скарочана ўсё запісаць (дыктафона ж не было). Пасля абеду расшыфроўваў запісы, вечарам паволі зачытваў тэкст, а гаспадар уносіў карэктывы. Так за тыдзень мы прайшлі асноўныя вехі жыццёвага шляху наркама», — распавядае Адам Восіпавіч у згаданай публікацыі.

Аўтабіяграфія «Шлях амаль у сотню год» была апублікавана ў «Полымі», а пасля, у 1981 годзе, у асобнай кнізе «Творы», у якой сабраныя вершы, п'есы, успаміны, урыўкі з прозы Язэпа Дылы. Пагартаўшы гэту кнігу, я, здаецца, знайшла адказ, чаму ён больш не вярнуўся ў Беларусь. «У 1930 годзе я апынуўся за межамі Беларусі. Жыў пераважна ў Саратаве. Там жыву і цяпер, часта вяртаючыся ў думках у край майго дзяцінства, юнацтва і сталасці. І сёння, азіраючы ў думках свой амаль 90-гадовы жыццёвы шлях, я радуюся, што лепшую частку гэтага шляху я прайшоў, верна служачы свайму народу, маёй Беларусі».

Ён не прыехаў назад, каб Беларусь засталася для яго такой, у якой яму дазвалялі жыць і працаваць, дзе былі жывыя і поўныя сіл яго паплечнікі і аднадумцы, якая была яго спраўджанай марай. Ад той Беларусі яму засталіся толькі ўспаміны на доўгае-доўгае жыццё. Ён не вярнуўся, але хто мае права яго за гэта папракнуць?

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

Мікалай БАРЫСЕНКА:

«...Чакайце нас, хлопцы! Мы вас знойдзем!»

Сенсацыйныя адкрыцці і новыя звесткі пра вайну ў чарговым «Пошукавым весніку», які прэзентавалі ў Магілёве

Аперзводкі, баявыя загады, данясенні — гэтыя ўнікальныя дакументы аб баявых дзеяннях 388-га стралковага і 601-га гаўбічнага артылерыйскага палкоў у ліпені 41-га пры абароне Магілёва ўпершыню за пасляваенны час сталі вядомы шырокай аўдыторыі. Іх знайшоў у архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі магілёўскі пошукавік і ваенны пісьменнік Мікалай Барысенка. Цяпер яны размешчаны ў адзіным на ўсю краіну выданні — «Пошукавым весніку», які стварае пры фінансавай дапамозе Магілёўскага аблвыканкама абласны гісторыка-патрыятычны пошукавы клуб «Віккру». А яшчэ тут шмат новай, упершыню агучанай інфармацыі пра тых, хто ваяваў і вярнуўся з вайны або знік без вестак, пакутаваў у нямецкім палоне, набліжаў Перамогу ў тыле. Кожная новая інфармацыя мае вялікую каштоўнасць. Яна як пазл у вялікай карціне, без якога тая ніколі не будзе поўнай.

300 СТАРОНАК ПРАЎДЫ ПРА ВАЙНУ

Прэзентацыя адбылася ў абласной бібліятэцы імя Леніна. У ёй прынялі ўдзел шматлікія аўтары публікацый — гісторыкі, пісьменнікі, навукоўцы, педагогі, журналісты, музейныя работнікі, пошукавікі і нават навучэнцы — усе тыя, каму неабыякавыя лёсы людзей, па якіх праехала цяжкае кола вайны. Сярод матэрыялаў ёсць артыкулы са старонак нашай газеты.

Знамянальна, што сёлета клуб «Віккру» адзначае чвэрць стагоддзя свайго існавання. За гэты перыяд яго байцамі паднята каля 1200 астанкаў чырвонаармейцаў і камандзіраў, адноўлены імёны 78 з іх. Сёння ў клуб уваходзяць 14 пошукавых груп і атрадаў, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Магілёўшчыны. І «Пошукавы веснік» — гэта своеасаблівая справаздача яго дзейнасці. У апошні зборнік увайшлі вынікі работы клуба за мінулы год.

Пачатак палявым работам дала вахта памяці ў Магілёўскім раёне, дзе на месцы абарончых баёў амаль цалкам загінуў батальён капітана Канстанціна Уладзіміра. Паднятыя астанкі 23 байцоў, у тым ліку аднаго міліцыянера.

Выданне не абмяжоўваецца звесткамі аб адной Вялікай Айчыннай вайне. Тут ёсць інфармацыя пра дзеянні польскіх легіянераў Доўбар-Мусніцкага на тэрыторыі Магілёўшчыны падчас Першай сусветнай вайны, цікавыя факты пра Друцкі лагер, дзе праходзілі палітычную і баявую падрыхтоўку ў 20-я гады мінулага стагоддзя чырвонаармейцы і савецкія камандзіры, успаміны сведкаў пра канцэнтрацыйны лагер ваеннапалонных у Крычаве, падрабязнасці пра напаўзабытых герояў абароны і вызвалення Магілёва, адкрыцці, звязаныя з дзейнасцю легендарнага батальёна міліцыі капітана Канстанціна Уладзіміра, адноўленыя імёны тых, хто лічыўся зніклым без вестак, і яшчэ шмат чаго іншага — больш за 300 старонак карыснай і раней невядомай інфармацыі.

ВАЙНА ХАВАЕЦЦА Ў АКОПАХ

Здавалася, што героі публікацый «Пошукавага весніка» сышлі з яго старонак. Навучэнцы магілёўскага каледжа мастацтваў, апранутыя ў салдацкія гімнасцёркі, нагадвалі тых, каму выпаў лёс змагацца за будучае вялікай краіны — такія ж маладыя і поўныя жыцця. Колькі іх не вярнулася і назаўсёды засталося маладымі, нават не падлічыць. І мы не маем права пра іх забыцца. Літаратурна-паэтычная кампазіцыя — гэта своеасаблівы рэквіем па іх.

— Пошукавая работа і наша выданне — гэта адзіны сёння сродак, які стаіць на пярэднім фронце барацьбы з бяспамяцтвам, які рэальна прыцягвае моладзь, — кажа **кіраўнік магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» Мікалай БАРЫСЕНКА.** — Гэта не нейкія разважалкі ў кніжках-мемуарах, а канкрэтная работа, адзінае, можна сказаць, жывое, што зараз робіцца па вайне. Тое, што сапраўды цікава моладзі, бо знаёмства адбываецца на мясцовасці — у акопах і траншэях. Нашы экспедыцыі — гэта вынік карпатлівай працы ў архівах, з базамі даных пошукавых сайтаў, стасункаў з пошукавікамі іншых краін. Мы спяшаемся схапіць як мага болей інфармацыі, каб ледакол вайны цалкам не пайшоў пад ваду. Шмат сцёртай інфармацыі, якую немагчыма прачытаць. І кожны новы факт, новае імя — гэта вырваная з небыцця інфармацыя, гэта рэальная навукова-даследчая работа па вайне, усё найноўшае, што ёсць на цяперашні час. Такога, каб мы дзесьці падглядзелі і сплагіяцілі, няма. А дакументы, якія ўвайшлі ў апошні зборнік, наогул ніхто не бачыў, акрамя некалькіх чалавек. Ветэраны вайны лічылі, што яны не захаваліся.

Вельмі важна высветліць ісціну, вярнуць героям не толькі імя, але і гонар. Адзін з матэрыялаў зборніка якраз аб гэтым. Даследаванне масквічоў Алены Макаравай і Аляксандра Мілюціна аднавіла добрае імя камандзіра 17-й стралковай дывізіі Пятра Казлова, ураджэнца Магілёўшчыны.

— Гэта вельмі важна, бо ён з ліку непрызнаных у савецкія гады камандзіраў, — кажа Мікалай Барысенка. — Увесь час лічылася, што лёс яго невядомы. Казлова абвінавачвалі ў тым, што ён супрацоўнічаў з немцамі. Сям'і героя таксама прыйшлося не салодка. Да іх ставіліся, як да родных здрадніка. У кастрычніку 41-га ён пры абароне Масквы трапіў у палон. Ніхто пра гэта не ведаў — ні вышэйстаячае камандаванне, ні яго дывізія. Немцы пераводзілі яго з лагера ў лагер, але ён не ішоў з імі на супрацоўніцтва. Наадварот, разам з таварышамі арганізаваў антыфашысцкае падполле. Іх раскрываюць і пераводзяць у лагер з вельмі жорсткім рэжымам. Там Пётр Казлоў гіне. Усе пасляваенныя гады пра гэта не ведалі, думалі, што ён працаваў у школе «Абвера», рыхтаваў дыверсантаў для закіду ў наш тыл. Усё раскрылася пасля таго, як нашым калегам з Расіі пашчасціла зазірнуць у нямецкія дакументы. Там было выразна бачна, што ён не здраднік.

ТЭМЫ ДЛЯ БУДУЧЫХ ПУБЛІКАЦЫЙ

Сёння ідзе актыўная напрацоўка матэрыялаў для будучага «Пошукавага весніка». Байцы клуба «Віккру» працуюць разам з калегамі з 52-га асобага спецыяльнага пошукавага батальёна Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Пачатак палявым работам дала вахта памяці ў Магілёўскім раёне, дзе на месцы абарончых баёў амаль цалкам загінуў батальён капітана Канстанціна Уладзіміра. Паднятыя астанкі 23 байцоў, у тым ліку аднаго міліцыянера. Яго імя ўстаноўлена па знойдзеных пры ім дакументах.

Толькі за дзень пошукавай экспедыцыі «Дняпроўскі рубеж» у Слаўгарадскім раёне атрымалася знайсці ў адзіночных акопах і варонках ад бомбаў астанкі 11 чырвонаармейцаў і камандзіраў. Па фрагментах амуніцыі высветлілі, што ўсе яны загінулі летам 1941 года. Па фрагментах пасведчання Асаавіяхіма «Варашылаўскі стралок» установлена імя радавога — Нурмухамеда Магдзеева, 1915 года нараджэння, ураджэнца Казахскай ССР, які быў прызваны на службу ў Чырвоную Армію 7 лютага 1940 года. Да прызыву жыў у горадзе Аральску, разам з маці. Апошні ліст ад сына яна атрымала 10 ліпеня 1941 года. Да гэтага часу радавы Нурмухамед Магдзееў лічыўся зніклым без вестак. Яго астанкі былі знойдзены на глыбіні паўметра на лясной дарозе, па якой у апошнія гады вазілі лес цяжкія лесавозы.

— Нурмухамед Магдзееў ураджэнец Кзылардзінскай вобласці, але па нацыянальнасці ён і ўся яго сям'я — татары, — удакладняе Мікалай Барысенка. — На наступны дзень пасля таго, як мы паведамілі родным пра знаходку, на месца раскопак прыехаў яго пляменнік Хаміт Магдзееў. Ён жыве ў Калужскай вобласці.

Імя яшчэ аднаго чырвонаармейца Андрэя Музыкі было ўстаноўлена падчас пошукавай экспедыцыі ў Быхаўскім раёне. Ён загінуў у ліпені 1941 года. Баец нарадзіўся ў 1914 годзе ў Палтаўскай вобласці, Абалонскім раёне. З вайны яго чакала жонка Таццяна. Цяпер вядзецца пошук родных радавога Андрэя Музыкі.

У Быхаўскім раёне палявыя работы праводзіліся на тэрыторыі Чырвонаслабодскага і Лудчыцкага сельскіх Саветаў — месцах баёў 102-й, 151-й і 380-й стралковых дывізій. За дзень раскопак было знойдзена дзевяць пахаванняў воінаў Чырвонай Арміі, дзе ляжалі астанкі 14 савецкіх салдат. Пры іх пошукавікі знайшлі пяць салдацкіх медальёнаў, а пры адным з байцоў — фрагменты асабістых дакументаў. Зараз усё гэта на экспертызе.

— Найбольш вызначыліся ў пошукавых работах у Слаўгарадскім і Быхаўскім раёнах Павел Кончыкаў, Аляксандр Халееў, Ілья Трыханаў, Сяргей Каралёў, Яўген Бацанаў, Анатоль Даронін, Аляксей Мірошенка, Сяргей Якубовіч, Віктар Храмянкоў і Дзмітрый Паклонскі, — адзначае Мікалай Барысенка. — А наперадзе яшчэ шмат работы. Адзін з аб'ектаў нашых пошукаў — самалёт у Клічаве. Работы шмат. Мы ведаем — загінулыя чакаюць нас. І мы ідзём да іх! Ідзём... Чакайце нас, хлопцы! Мы вас знойдзем!

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота Святланы БАРЫСЕНКІ.

Межы адкрываюцца для гасцей

Усе нюансы бязвізавага ўезду падчас II Еўрапейскіх гульняў растлумачылі спецыялісты



Да старту вялікай падзеі застаецца 17 дзён, а першыя госці ўжо пачынаюць прыбываць у Беларусь. Чакаецца, што ў рамках Еўрапейскіх гульняў нашу краіну наведае каля 30 тысяч замежнікаў, па статыстыцы продажу квіткоў найбольшай цікавасцю мерапрыемства карыстаецца ў грамадзян Расіі, Ірландыі, Латвіі, Польшчы і Літвы. Спецыялісты прагназуюць, што большасць турыстаў будуць трапляць у краіну праз Нацыянальны аэрапорт Мінск.

АДЗІН БІЛЕТ — АДЗІН УЕЗД

Адной з галоўных задач у гэты месяц з'яўляецца забеспячэнне камфортнага рэжыму для наведвання Гульняў удзельнікамі, балельшчыкамі і прадстаўнікамі СМІ. У рамках падрыхтоўкі да форуму была праведзена велізарная работа, якая патрабавала прыняцця шэрагу рашэнняў па рэгуляванні парадку ўезду на тэрыторыю Беларусі ў перыяд Гульняў на самым высокім узроўні.

«Меры, якія былі прынятыя, можна назваць беспрэцэдэнтнымі», — гаворыць **намеснік дырэктара фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Анатоль КОТАЎ,** расказваючы пра бязвізавы рэжым, які будзе дзейнічаць падчас правядзення турніру, і адзначаючы, што ён ні ў якім разе не адмяняе тых паслабленняў, якія ўжо існуюць у парадку ўезду на тэрыторыю Беларусі. *«У нас ёсць некалькі катэгорый асоб, якія будуць прымаць удзел у II Еўрапейскіх гульнях. Першая — арганізатары ці падрадчыкі Гульняў, якія атрымліваюць дакумент пад назвай «акрэдытацыйная карта». Для іх адмысловы бязвізавы рэжым ужо пачаў дзейнічаць з 20 мая»,* — расказвае Анатоль Анатолевіч. Гэтыя асобы могуць трапіць у Беларусь праз любы пункт пропуску, прад'явіўшы акрэдытацыю і дзеючы пашпарт, перасякаць мяжу ў перыяд з 20 мая да 10 ліпеня яны могуць неабмежаваную колькасць разоў. Дарэчы, ужо 13 акрэдытаваных асоб прыбыло ў Беларусь.

Для тых, хто хоча прыехаць у нашу краіну ў якасці гледача, бязвізавы рэжым будзе дзейнічаць з 10 чэрвеня да 10 ліпеня пры наяўнасці білета на любое спартыўнае спаборніцтва ў рамках Еўрапейскіх гульняў. *«Мы спецыяльна не сталі абмяжоўваць бязвізавы рэжым рамкамі спаборніцкіх дзён, бо выдатна разумеем, што хтосьці прыедзе на пару дзён раней спаборніцтваў або захоча затрымацца трохі даўжэй пасля заканчэння Гульняў, каб бліжэй пазнаёміцца з нашай краінай»,* — адзначае Анатоль Котаў.

Трапіць у Беларусь без візы можна будзе і праз Расію, рэжым пропуску на нашых усходніх рубяжах будзе аналагічны таму, што мы бачылі летась падчас правядзення чэмпіянату свету па футболе. **Намеснік начальніка галоўнага консульскага ўпраўлення Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь Аляксандр ГАНЕВІЧ** паведаміў, што летась з расійскім бокам было падпісана так званае спартыўнае пагадненне, яно прадугледжвае не толькі транзіт па Расіі, але і бязвізавае знаходжанне на гэтай тэрыторыі да 10 ліпеня. *«Але замежнікам неабходна памятаць, што яны павінны знаходзіцца ў Расіі па законах гэтай краіны, калі неабходна рэгістрацыя, то яны павінны яе прайсці. Таксама абавязкова адзначу, што па адным білеце грамадзянін можа перасекчы мяжу ўсяго адзін раз, калі ён межы пакідае, то заехаць яшчэ раз можа толькі па новым білеце або візе»,* — акцэнтуе ўвагу Аляксандр Дармідонтавіч.

Таксама варта адзначыць, што падчас Гульняў госці, якія прыбываюць па білеце на ўласным транспарце, вызваляюцца ад платы за карыстанне дарогамі, а акрэдытаваныя асобы і ад абавязковага медыцынскага страхавання.

Начальнік аддзела ўпраўлення пагранічнага кантролю Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь Кузьма ЛЯСНЯК таксама адзначыў, што замежнікам варта звярнуць увагу на тое, што калі яны едуць праз Расію, то перасячы беларуска-расійскую мяжу могуць не ўсюды. *«Для гэтага ёсць тры аўтамабільныя дарогі, тры чыгуначныя напрамкі і Нацыянальны аэрапорт Мінск, усё астатняе будзе лічыцца парушэннем заканадаўства Расійскай Федэрацыі»,* — растлумачыў Кузьма Мікалаевіч.

У пунктах пропуску ўжо ўстаноўлены спецыяльныя абазначэнні калідораў і рабочых месцаў пагранічнікаў і мытнікаў сімваламі Еўрапейскіх гульняў, імі госці, якія прыбываюць на форум, могуць скарыстацца па-за чаргой.

Пры перасячэнні межаў чалавек павінен дакладна заявіць аб тым, у якім рэжыме ён заязджае ў Беларусь. Калі па білеце Еўрапейскіх гульняў, то час знаходжання будзе абмяжоўвацца 10 ліпеня, калі па бязвізавым рэжыме ў рамках Указа № 8 праз Нацыянальны аэрапорт, то 30 дзён знаходжання могуць скончыцца і пазней, але ў гэтым выпадку варта памятаць, што пакінуць Беларусь замежнік можа таксама толькі праз аэрапорт. Спецыялісты адзначаюць, што пажадана, каб беларускія госці не блыталі гэтыя рэжымы ўезду, інакш могуць узнікнуць пытанні пры іх выездзе.

«Міністэрства ўнутраных спраў прымае ўсе арганізацыйныя і практычныя меры для забеспячэння бяспекі і камфорту нашых грамадзян, замежных балельшчыкаў і ўдзельнікаў Гульняў, — расказвае **начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Рэспублікі Беларусь Аляксей БЯГУН.** — *Усе замежныя грамадзяне, якія купілі білеты, павінны ў абавязковым парадку аўтарызавацца на сайце афіцыйнага білетнага аператара кампаніі «Тікетпро» і паведаміць пра сябе персанальныя даныя, якія звязаны з грамадзянствам, нумарам пашпарта і датай нараджэння для таго, каб мы змаглі забяспечыць ім камфортнае знаходжанне ў Беларусі. Таксама адзначу, што ўезд у Беларусь магчымы толькі ў дзень або да старту спартыўнага мерапрыемства, на якое набыты білет. Гэта значыць, калі яно ўжо адбылося, ва ўездзе на тэрыторыю нашай краіны і Расіі будзе адмоўлена. Для балельшчыкаў мы распрацавалі спецыяльныя памяткі, у якіх будзе інфармацыя аб працэдуры рэгістрацыі, рэчах, якія забароненыя для праносу на арэны, і іншае».*

Журналісты з Ганы і турысты з Нігерыі

Практыка бязвізавага ўезду ў Беларусь ужо была адпрацавана ў 2014 годзе падчас правядзення ў краіне чэмпіянату свету па хакеі і ў 2018 годзе падчас чэмпіянату свету па футболе ў Расіі. Аднак тады былі зафіксаваныя выпадкі злоўжывання бязвізавым рэжымам. Напрыклад, апошні «хакейны балельшчык» быў адпраўлены дадому толькі ўлетку 2015 года, а ў цэлым зафіксавана больш за 400 выпадкаў злоўжывання бязвізавым уездам. *«Напрыклад, расійскія калегі дагэтуль ловяць балельшчыкаў, якія прыбылі на чэмпіянат свету па футболе, але своечасова не пакінулі межы краіны»,* — адзначае Аляксей Бягун.

Спробы злоўжывання будуць і цяпер, упэўнены спецыялісты, у сувязі з гэтым прынята рашэнне, што бязвізавы рэжым усталёўваецца толькі ў дачыненні да грамадзян 76 краін, якія не ўяўляюць міграцыйную небяспеку для Беларусі. Грамадзяне іншых дзяржаў, каб трапіць у нашу краіну падчас Еўрапейскіх гульняў нават пры наяўнасці білета, павінны атрымаць візы. У гэтым выпадку білет на спаборніцтвы стане важкім аргументам для атрымання права на ўезд.

«Каля 2 тысяч білетаў было набыта грамадзянамі Ірака, — расказвае Аляксандр Ганевіч. — *А за апошнія гады мы мелі адтуль больш за 14 тысяч турыстаў, якія прыязджаюць і з'язджаюць ад нас не парушаючы законы. Для іх білет на Еўрапейскія гульні будзе падставай для атрымання візы».*

«Яшчэ ў нас былі запыты на білеты ад турыстаў з Нігерыі, — дадае **дырэктар афіцыйнага білетнага аператара II Еўрапейскіх гульняў — кампаніі «Тікетпро» Кірыл СУШЧЫНСКІ.** — *Але далей запытаў справа не пайшла».*

